№№115–116
(3452–3453)

2 жніўня 2011 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ПАД ГРАДУСАМ

Кароткачасовыя дажджы

3 жніўня ў Беларусі прагназуецца пераменная воблачнасць. У асобных раёнах кароткачасовыя дажджы. Вецер паўночна-ўсходні 4—9 м/с, днём па паўднёвым усходзе парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу 7—14°С, днём 18—24°С.

4 жніўня ў Беларусі чакаецца невялікая воблачнасць. Пераважна без ападкаў. Вецер паўночны 3—8 м/с. Тэмпература паветра ноччу 6—13°С, днём 18—25°С.

ЗДЗЕК

Хто зможа пражыць на 170 тысяч рублёў у месяц?

У Беларусі па 31 кастрычніка 2011 года мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек складзе 675 980 рублёў у разліку на месяц, гаворыцца ў паведамленні Мінпрацы і сацабароны.

Новы МСБ сям'і з чатырох чалавек павялічыўся на 28,8% у параўнанні з дзеючым у маі-ліпені. Але ўсё роўна атрымоўваецца, што на кожнага ў сям'і прыходзіцца па 170 тысяч рублёў. Як можна пражыць на такія грошы, дзе знайсці тыя цэны, па якіх робіць разлікі Міністэрства працы?

Нагадаем, што мінімальны спажывецкі бюджэт уяўляе сабой выдаткі на набыццё набору спажывецкіх тавараў і паслуг для задавальнення асноўных фізіялагічных і сацыяльна-культурных патрэбнасцяў чалавека. Яны зацвярджаюцца Мінпрацы штоквартальна ў цэнах апошняга месяца квартала для 8 сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва. МСБ прымяняецца як сацыяльны нарматыў для прагназавання змяненняў узроўню жыцця насельніцтва і ўзмацнення сацыяльнай падтрымкі маламаёмных грамадзян.

Зараз МСБ сям'і з чатырох чалавек служыць асновай для вызначэння права грамадзян на атрыманне льготных крэдытаў і субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў.

ПОГЛЯД ЗБОКУ

Брытанскі міністр заклапочаны смяротнай карай у Беларусі

Брытанскі міністр па справах Еўропы Дэвід Лідынгтан заклапочаны ўжываннем смяротнага пакарання ў Беларусі.

"Я быў надзвычай заклапочаны тым, што ў Беларусі нядаўна былі прыведзены ў выкананне два смяротныя прысуды ў дачыненні да беларускіх грамадзян Алега Грышкаўцова і Андрэя Бурдыкі", — цытуе міністра Interfax.by. Пры гэтым Д.Лідынгтан падкрэсліў, што *"цалкам усведамляе ўсю сур'ёзнасць здзейсненага імі злачынства і глыбока спачувае ўсім пацярпелым". "*

Лідынгтан заклікаў улады Беларусі *"ўвесці афіцыйны мараторый на смяротнае пакаранне ў якасці першага кроку да яе адмены і далучыцца да іншых еўрапейскіх краін у іх намаганнях зрабіць усю Еўропу зонай, свабоднай ад смяротнага пакарання".*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Алена ЛІХАВІД:

«Турма выхоўвае волю...»

Падумаць толькі: на трое сутак жанчыну кінулі ў камеру-адзіночку. І якую жанчыну — маці палітвязня Мікіты Ліхавіда! Кінулі за тое, што яна патрабавала законнага выканання ўнутранага распарадку спецустановы...

Пра сваё знаходжанне ў няволі Алена Ліхавід распавяла карэспандэнту "Народнай Волі".

— Напачатку я б хацела расказаць пра тое, як адбываўся суд нада мной. — Гэта сапраўдны спектакль, дзе ролі адведзены кожнаму з удзельнікаў "працэсу". Прычым законныя правы абвінавачанага парушаюцца на кожным кроку.

Адбывалася ўсё ў судзе Цэнтральнага раёна сталіцы. Яшчэ да пачатку судовага працэсу я патрабавала сустрэчы сам-насам са сваім адвакатам Дар'яй Ліпкінай. Мне беспадстаўна адмовілі. У ходзе судовага працэсу адвакат стала патрабаваць, каб нам далі канфідэнцыйна перагаварыць. Суд адмовіў і ёй. І толькі пасля таго, як Дар'я Ліпкіна папрасіла занесці гэтую адмову ў пратакол судовага пасяджэння, суд дазволіў нам пагаварыць сам-насам у асобным пакоі. Роўна тры хвіліны. Мне таксама адмовілі ў тым, каб на судзе прысутнічалі блізкія і родныя.

У мяне склалася ўражанне, што сведкі, а гэта, зразумела, супрацоўнікі міліцыі, якія выступалі ў судзе, напярэдадні завучвалі тэкст сваіх паказанняў. Яны гаварылі, як па напісанаму! Казалі, што яны мяне ведаюць, бачылі і затрымлівалі на вуліцы Леніна. Маўляў, я пляскала ў далоні і тупала нагамі, чым перашкаджала руху пешаходаў. Ці варта казаць, што людзі, якія давалі паказанні ў судзе, ніякага дачынення да майго затрымання не маюць? Мяне затрымлівалі зусім іншыя людзі. У тым, што гэта загадзя зрэжысіраваны спектакль, я ўпэўнілася тады, калі для вынясення прысуду суддзя Вайцэховіч нават не выйшла ў дарадчы пакой. Прысуд быў агучаны на месцы — 10 сутак. Гэта дае падставы меркаваць, што мой лёс быў вырашаны яшчэ да пачатку "разбіральніцтва"...

— Потым вы трапілі на Акрэсціна...

— Я трапіла ў камеру, дзе разам са мной знаходзілася шэсць чалавек. Усе ўдзельнікі акцыі. А пазней нас стала восем чалавек — падсялілі яшчэ дзвюх жанчын, якія трапілі за краты за бытавыя правапарушэнні.У камеры знаходзіцца "сцэна" — нашы спальныя месцы, рукамыйнік і туалет. Спальных месцаў хапала не ўсім — адзін чалавек спаў на падлозе. Умовы, канечне, жудасныя. Кармілі нас тройчы на дзень — раніцай аўсяная каша, прычым яна была альбо моцна салёная, такая, што нават і не паспрабаваць, альбо не салёная ўвогуле. На абед нам давалі суп, які больш нагадвае ваду, у якой плавае парачка капусных кавалачкаў альбо некалькі гарошынак. На другое — зноў-такі каша — пярловая ці рысавая з падабенствам хлебнай катлеты. На вячэру — гарбата, якая моцна пахла содай, мы яе не пілі... І ўвесь час давалі шмат шэрага фармавога хлеба. Вось так мы з хлеба на ваду і перабіваліся. Справа ў тым, што зняволеным забаронена перадаваць ежу з волі — толькі ваду і сокі.

— Трое апошніх сутак свайго арышту вы правялі, як ахрысцілі некаторыя сайты, у карцары спецпрыёмніка-размеркавальніка на Акрэсціна. За што туды трапілі?

— Ну, карцар — гэта я ўмоўна называю камеру-адзіночку, у якой я знаходзілася. Перавялі мяне туды без усялякіх тлумачэнняў. За што? Мяркую, за тое, што я настойвала на выкананні ўсталяваных законам правілаў спецпрыёмніка-размеркавальніка. Я амаль кожны дзень патрабавала, каб нас вывелі на прагулку. Штотыднёвыя прагулкі для зняволеных прадугледжаны законам. Але за 10 дзён я так і не ўдыхнула свежага паветра. Супрацоўнікі спецпрыёмніка спасылаліся на тое, што ў іх не прадугледжана месца для прагулак. Запрашалі адправіцца да іх "на суткі" праз год. Маўляў, у наступным годзе дворык для прагулак абавязкова з'явіцца. Акрамя таго, я штодзень патрабавала, каб, згодна з унутраным распарадкам установы, рэгулярна праветрывалі камеры. Гэта павінна адбывацца не менш за 14 разоў у суткі. Што такое праветрыванне па-акрэсцінску? Праветрываннем лічыцца адкрытая на кароткі тэрмін "кармушка" камеры, праз якую зняволеным падаюць ежу. Былі такія дні, калі камеры праветрывалі толькі два разы на дзень. Гэта напрамую залежала ад настрою ахоўнікаў... Людзі там працуюць розныя. Ёсць тыя, у каго яшчэ засталося сумленне, адпаведна, і стаўленне з іх боку да зняволеных чалавечнае. А ёсць там і такія, хто паказвае сваю ўладу зняволеным... Некаторых, напрыклад, раздражняў наш смех. Нават знаходзячыся ў камеры, мы стараліся не губляць прысутнасць духу. Здаралася, на наш смех у камеру заходзіў ахоўнік. І пасля абразаў у наш адрас дадаваў: "Вечна з вамі, жанчынамі, гемарой..."

— Алена, як змяніўся ваш светапогляд пасля дзесяці сутак арышту?

— Я стала мацней. Калі тыя, хто адправіў мяне "на суткі", думаюць мяне гэтым самым зламаць, дык нічога ў іх не атрымаецца. Наадварот, пасля адсідкі я зразумела, што гэтая сістэма ўсталявала ўнутры мяне такі моцны маральны стрыжань, зламаць які будзе вельмі і вельмі няпроста. Мне ўжо не страшна. Тыя, хто працуе ў гэтай карнай сістэме, не разумеюць аднаго: іх турма выхоўвае ў чалавеку волю. І робіць чалавека больш моцным. І ў мяне ўжо проста няма права апускаць рукі, трэба змагацца, каб хоць нешта ў краіне змянілася да лепшага...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ПАДЛІЧЫЛІ

Рэкардсмены па даўгах

Дзяржаўны доўг Беларусі на 1 ліпеня 2011 года склаў эквівалент 69,952 трыльёна рублёў. Ён павялічыўся на 82,5% з пачатку года, у тым ліку на 8,3% за чэрвень.

Пры гэтым вонкавы дзярждоўг у рублёвым эквіваленце вырас на 98,4% за шэсць месяцаў гэтага года.

ПАРАЛЕЛІ

Беларусь лідзіруе ў Еўропе і СНД па росце спажывецкіх цэн

Наша краіна ў лідарах па росце спажывецкіх цэн у чэрвені.

Згодна са звесткамі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, рост спажывецкіх цэн у Беларусі ў чэрвені адносна мая склаў 8,6%, у той час як **у Германіі і Італіі** цэны ўзраслі на 0,1%, **у Расіі** — на 0,2%, **у Казахстане, Латвіі, Фінляндыі** — на 0,3%, **ва Украіне** — на 0,4%.

У Эстоніі і Славакіі ў чэрвені цэны не змяніліся, а ў шэрагу іншых краін нават знізіліся: **у Балгарыі** — на 0,9%, **Венгрыі, Чэхіі** — на 0,2%, **Ірландыі, Іспаніі, Літве** — на 0,1%, **Нарвегіі, Польшчы** — на 0,4%, Турцыі — на 1,4%.

Цэны на прадукты харчавання і безалкагольныя напоі ў Беларусі ўзраслі ў чэрвені на 8,2%, у Іспаніі і Італіі — на 0,1%, у Казахстане — на 0,2%, ва Украіне — на 0,3%, у Фінляндыі — на 0,4%. У Германіі цэны на прадукты не змяніліся. У астатніх краінах назіралася зніжэнне цэн: у Балгарыі — на 2,4%, Венгрыі — на 1,2%, Латвіі — на 0,2%, Літве — на 0,8%, Нарвегіі — на 0,7%, Польшчы — на 1,8%, Расіі — на 0,4%, Славакіі — на 0,5%, Турцыі — на 6,4%, Чэхіі — на 1,5%, Эстоніі — на 0,6%.

У чэрвені Беларусь таксама была лідарам па росце цэн на жыллёвыя паслугі, ваду, электрычнасць і газ — яны павялічыліся на 5,7% адносна мая. У Італіі і Казахстане цэны на гэтыя паслугі не змяніліся; у Балгарыі і Славакіі — узраслі на 0,1%, у Венгрыі, Германіі, Польшчы, Расіі, Турцыі — на 0,2%, Літве — на 0,3%, ва Украіне — на 0,4%, у Ірландыі — на 0,5%, Фінляндыі і Чэхіі — на 0,8%, Латвіі і Эстоніі — на 1,2%. У Іспаніі і Нарвегіі кошт гэтых паслуг знізіўся на 0,1 і 0,6% адпаведна.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

К теракту в минском метро оппозиция не причастна

Следствие не считает, что теракты, совершенные в Беларуси в 2005, 2008 и 2011 годах, носили заказной характер.

Об этом вчера сообщил журналистам замгенпрокурора Беларуси ***Андрей Швед****.*

"*Со всей ответственностью заявляю, что в процессе расследования уголовного дела, производства комплекса оперативно-розыскных мероприятий, данных, указывающих на наличие за спиной* ***Влада Ковалева*** *и* ***Дмитрия Коновалова*** *каких-либо спонсоров или заказчиков, нет,* — сказал чиновник. — *Даже косвенных данных нет. Они действовали самостоятельно*".

Ковалеву вменяется в вину участие в 15 эпизодах противоправных деяний, в том числе соучастие в акте терроризма в минском метро, незаконный оборот взрывчатых веществ, недонесение о преступлении, укрывательство орудия преступления, сообщает belta.by.

Коновалов обвиняется в совершении более 30 преступных эпизодов, в том числе он обвиняется в 4 актах терроризма, незаконных действиях со взрывчатыми веществами, особо злостном хулиганстве, умышленном повреждении имущества общеопасным способом.

"Итогом их преступной деятельности стала гибель 15 граждан Беларуси, сотни покалеченных жизней, материальный ущерб в размере более 2 миллиардов белорусских рублей", — сказал заместитель генпрокурора.

ПАЗІЦЫЯ

Адвакаты не пагаджаюцца з Міністэрствам юстыцыі

Адвакаты Ганна Бахціна і Дар'я Ліпкіна, якія не прайшлі ініцыяваную Міністэрствам юстыцыі пазачарговую атэстацыю, маюць намер адстойваць сваё права на прафесійную дзейнасць.

Ганна Бахціна, якая абараняла Ірыну Халіп, паведаміла БелаПАН, што *"ад сваіх планаў, ад сваіх жаданняў абараняць сябе саму я не адмаўляюся, і буду рабіць гэта ў поўнай меры"*.

Дар'я Ліпкіна, якая абараняла фігуранта крымінальнай справы аб масавых беспарадках Мікіту Ліхавіда, заявіла, што не згодна з рашэннем атэстацыйнай камісіі.

"*Атэстацыйная камісія не мае права што-небудзь вырашаць наконт спынення паўнамоцтваў або працягу дзейнасці*", — адзначыла адвакат.

Згодна з працэдурай, матэрыялы атэстацыйнай камісіі перадаюцца ў кваліфікацыйную камісію, якая прымае рашэнні.

ПАСЛЯ СУДА

Скаргі Шульмана не даюць вынікаў

Былы прадзюсар Генадзь Шульман, якога асудзілі на 6 гадоў, не пакідае намаганняў абскардзіць свой прысуд.

Ужо амаль год былы прадзюсар і арганізатар канцэртаў Генадзь Шульман абскарджвае рашэнне суда. Нагадаем, што яго асудзілі за махлярства. Суд прызначыў яму пакаранне ў выглядзе 6 гадоў зняволення з адбываннем пакарання ў калоніі ўзмоцненага рэжыму і канфіскацыяй маёмасці.

На працягу некалькіх гадоў Шульман пазычаў грошы для вядзення бізнесу, але ў прызначаны тэрмін так і не вяртаў пазыкі. У выніку былыя сябры і калегі прадзюсара звярнуліся ў праваахоўныя органы. На судзе Шульман сцвярджаў, што збіраўся вярнуць грошы. Між тым у яго добрыя памкненні не паверылі ні пацярпелыя, ні суд.

"Мы падаём скаргі, але пакуль усё безвынікова, — распавяла "Народнай Волі" адвакат Шульмана **Алена Пугачова**. — *Зараз будзем накіроўваць скаргу ў Гарадскі суд. Калі ён яе не задаволіць, то пойдзем у вышэйшыя інстанцыі. Цягнуцца гэта можа вельмі доўга. На адну скаргу губляецца 2–3 месяцы"*.

Зараз Шульман знаходзіцца ў віцебскай калоніі, а яго жонка і сын дагэтуль не жадаюць размаўляць з прэсай.

Марыя МАЛЕВІЧ.

ЭХО КОНФЛИКТА

Занесло...

В конце июня на страницах "Народной Воли" была помещена корреспонденция под названием "Как "выдворяли" председателя знаменитого "Рассвета" Александра Шаплыко". В ней рассказывалось о неожиданном визите в хозяйство председателя райисполкома, прокурора и сотрудников других правоохранительных органов. Тогдашнее объявление руководителя района об отстранении А.Шаплыко от занимаемой должности закончилось тем, что у него забрали ключи от служебного кабинета, ключи от машины и он якобы ушел в отпуск.

Но вот наступила окончательная развязка конфликта, а точнее — скандала. Несколько дней назад известные Мышковичи — центр хозяйства — опять гудели словно пчелиный улей. Такого шумного собрания здесь не помнят даже старожилы. В его повестке уже официально стоял вопрос об освобождении от занимаемой должности председателя СПК "Рассвет" Александра Шаплыко. Девять лет на руководящем посту в прославленном хозяйстве — и такой финиш!

Что произошло? На этот вопрос пытались ответить многие из тех, кто выступил на собрании. Людей, понятно, волнует то, что "Рассвет", входящий в число 60 базовых сельхозпредприятий страны, сдает позиции. Почти все задания по производству основных видов продукции в прошлом году оказались провальными. В первой половине нынешнего года получили молока и говядины меньше, чем за соответствующий период прошлого.

Спад в производстве продукции, конечно же, отрицательно сказался на финансовом положении "Рассвета". Выручка СПК в 2010 году составила 43 миллиарда рублей, а задолженность по кредитам и процентам — 45 миллиардов. А на 1 июля нынешнего года банковские долги составили уже 70 (!)миллиардов рублей.

Когда Александра Шаплыко направляли на работу в "Рассвет", учитывались его профессиональные качества. Но, похоже, он их вскоре растерял. Чувствовалось, что жизнь обгоняет его, понадеявшегося на старый багаж знаний и вчерашнюю практику. А тут еще стало заносить в плане морали. На коллективное хозяйство он в определенном роде стал поглядывать, как на свое личное. Можно сказать, в открытую пошел на нарушение принципа социальной справедливости при акционировании хозяйства. В кулуарах собрания говорилось, что председатель вместе со своим заместителем посягнули аж на 37 процентов акций хозяйства. И это в то время, когда некоторые пенсионеры, отдавшие "Рассвету" не один год жизни, получили предложение забрать свои доли, оцененные в 196 тысяч рублей (?!).

Не красят А.Шаплыко и многие другие факты. Василий Старовойтов, тот самый, который, как и прославленный К.Орловский, немало сделал для развития и укрепления "Рассвета", сегодня не разделяет многое из того, что делал А.Шаплыко.

Теперь у А.Шаплыко есть время подумать...

— Сам факт акционирования хорош, — говорит Василий Константинович. — Но нужно было создать комиссию, которая тщательно изучила бы "за" и "против". Чтобы потом не было стыдно ни перед собой, ни перед людьми, ни перед Богом и завтрашним днем.

Почувствовав себя удельным князьком, А.Шаплыко не слышал умных советов. Не воспринимал он и критику в свой адрес. И вот итог — из 538 работающих членов кооператива 443 человека проголосовали за освобождение Александра Шаплыко от должности председателя СПК "Рассвет" имени Кирилла Орловского. 115 из 130 проголосовавших пенсионеров также отказали ему в доверии.

Петр СИДОРЧУК.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
2 ЖНІЎНЯ 2011 г.

ІНІЦЫЯТЫВА

Народныя сходы могуць прывесці Беларусь да чакаемых перамен

Некалькі месяцаў таму на шэрагу сайтаў, у незалежнай прэсе з'явілася інфармацыя, што вядомымі грамадскімі актывістамі Віктарам Івашкевічам і Генадзем Фядынічам вылучана ініцыятыва правесці 8 кастрычніка па ўсёй краіне Народныя сходы, на якіх працоўныя, інтэлігенцыя, пенсіянеры, усе жыхары Беларусі змогуць выказаць думкі, меркаванні наконт сітуацыі, у якой апынулася нацыя, наконт тых першачарговых палітычных, эканамічных, культурніцкіх задач, якія неабходна тэрмінова вырашаць, адным словам, адкрыта пагаварыць пра лёс Айчыны ў гэты цяжкі, няпросты час.

"Народная Воля" вырашыла пацікавіцца, наколькі нечаканая ініцыятыва атрымала працяг і што могуць сказаць грамадскасці тыя, хто выйшаў да яе з прапановай наконт правядзення так званых Народных сходаў.

*Сёння наш субяседнік — **Віктар Івашкевіч**, сустаршыня аргкамітэта па правядзенні Народных сходаў.*

Віктар Івашкевіч: "Так, народ павінен сказаць сваё слова..."

— Першае пытанне: што вас падштурхнула да ідэі правядзення па ўсёй краіне Народных сходаў?

— Калі коратка казаць — гэта тое абрабаванне народа, якое адбылося ў апошнія месяцы. Хто мог падумаць, што беларускі рубель абрынецца адразу амаль на 60 працэнтаў?! З-за дэвальвацыі сярэдні памер пенсіі ў эквіваленце знізіўся са 193 (на пачатку мая) да 115 долараў.

І тут жа шалёны рост цэн. Людзям з нізкімі даходамі, мізэрнымі пенсіямі сёння застаецца хадзіць у магазіны, як у музеі — толькі паглядзець на дарагэзныя прадукты, тавары паўсядзённага попыту.

Вядома ж, у любой цывілізаванай краіне пасля такога абвалу ўрад сышоў бы ў адстаўку. Але ж у нас краіна, у якой пануюць іншыя правілы. Людзей, якія мелі смеласць сказаць праўду пра сённяшнюю ўладу, пра яе паводзіны падчас прэзідэнцкіх выбараў, пра сітуацыю ў эканоміцы, іншых сферах жыцця, кінулі ў турмы. За кратамі пакутуюць нават экс-кандыдаты ў прэзідэнты Андрэй Саннікаў, Мікалай Статкевіч, Дзмітрый Усс, дзясяткі іншых палітычных актывістаў.

Дык што, будзем моўчкі глядзець на тое, як наша жыццё становіцца невыносна цяжкім? Ці возьмемся за рукі і разам пачнём бараніць свае правы і сваю годнасць? Пакуль пратэстуюць сотні ці нават тысячы чалавек, з намі ніхто не будзе лічыцца. Толькі тады, калі сваё слова скажуць мільёны грамадзян, улады вымушаны будуць рэагаваць адпаведным чынам.

— А якія першачарговыя патрабаванні, на ваш погляд, будуць вылучацца падчас правядзення Народных сходаў?

— Галоўнае патрабаванне — **вярніце людзям тое, што ў іх скралі!**

Вярніце заробкі і пенсіі да тых памераў (у доларавым эквіваленце), якімі яны былі на пачатку года!

Вярніце ўкладчыкам банкаў 1,3 мільярда долараў, што яны згубілі ў выніку дэвальвацыі!

Спыніце рост цэн!

Дайце людзям магчымасць свабодна абменьваць беларускія рублі на валюту і вяртаць валютныя крэдыты ў беларускіх рублях!

Адным словам, стварыце людзям умовы для нармальнага жыцця. Нельга мірыцца з тым, што ў нас сёння адбываецца страшэннае расслаенне людзей на звышбагатых і жабракоў — на адным полюсе невялічкая купка тых, хто ва ўладзе і хто прыбліжаны да яе, хто не ведае, куды падзець грошы, на другім — астатняя частка грамадства, якая мае жабрацкае існаванне.

— Патрабаванні могуць быць самыя розныя, але дзе ўлады возьмуць грошы, каб іх выканаць?

— На пытанне адкажу шэрагам пытанняў. Скажыце, калі ласка, а дзе грошы ад гандлю зброяй? Дзе грошы ад канфіскацыі тавараў на мытнях? Дзе грошы ад транзіту ды рээкспарту тавараў у Расію? Дзе грошы ад розных латарэй і азартных гульняў? Дзе грошы ад арэнды дзяржаўнай маёмасці, гатэляў, турызму і многага іншага? Вы ведаеце, колькі грошай штогод трапляе ў так званы рэзервовы прэзідэнцкі фонд і на рахункі Упраўлення справамі Адміністрацыі прэзідэнта?

Беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы некалькі месяцаў працавалі са стратамі не таму, што нафта дарагая ці няма попыту на іх прадукцыю. У 2007 годзе ўрад стварыў закрытую структуру — ЗАТ "Беларуская нафтавая кампанія", якая ўсе прыбыткі ад гандлю нафтапрадуктамі забірае сабе, а заводам адшпільвае капейкі за выкананне працы. Куды ідуць гэтыя грошы, колькі кампанія плаціць падаткаў і ці плаціць іх наогул — невядома нікому, бо акцыянернае таварыства закрытае, а значыць, справаздачы даваць не абавязана. У спісах найбуйнейшых падаткаплацельшчыкаў Беларусі яго наогул няма.

Гэтак жа з дзяржаўных прадпрыемстваў выпампоўвае грошы і бліжэйшае атачэнне ўлады. Украінская газета "Дело" ацэньвае маёмасць кіраўніка дзяржаўнага прадпрыемства "Белтэхэкспарт" Уладзіміра Пефціева на мільярд долараў. Гандаль зброяй, вядома, звышпрыбытковы бізнес, але ўсе грошы павінны трапляць у дзяржаўны бюджэт, а не ў прыватныя кішэні? Не думаю, што Еўрасаюз выпадкова ўнёс У.Пефціева ў спіс тых, супраць каго ён вылучыў пэўныя санкцыі.

— А калі Лукашэнка праігнаруе Народныя сходы і не прыслухаецца да іх патрабаванняў, што вы, ініцыятары, збіраецеся рабіць?

— Калі Лукашэнка плюне на народныя патрабаванні, мы будзем набліжаць той час, калі за ўсё давядзецца адказваць па законе. Узгадаем яму і тыя абяцанкі, якія ён даваў і якія не спраўдзіліся.

17 снежня мінулага года, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, Аляксандр Лукашэнка заяўляў: *"Мы сегодня имеем достаточно золотовалютных резервов, примерно 6—7 млрд долларов, для того, чтобы удовлетворить любой спрос на валюту... Нам нет необходимости девальвировать национальную валюту".*

17 сакавіка гэтага года галава Нацбанка Пётр Пракаповіч запэўніваў людзей: *"Пока я являюсь председателем правления Нацбанка, никакой разовой одномоментной девальвации никогда не будет".*

16 красавіка Лукашэнка абяцаў: *"Сегодня-завтра-послезавтра мы выровняем ситуацию по валюте — это дело нескольких дней, может быть, неделя".*

12 мая Лукашэнка казаў: *"Через один-два месяца мы спокойно забудем всякие валютные неурядицы".*

А 23 мая Лукашэнка разам з тым жа Пракаповічам, лічы, адным махам забралі ў людзей палову заробкаў і палову іхніх банкаўскіх укладаў.

— Калі зыходзіць з Канстытуцыі, законаў, то, безумоўна, любы чалавек мае права на ініцыятыву. Але яна павінна палягаць у прававым рэчышчы. Скажыце, беларускім заканадаўствам не забаронена мерапрыемства, якое вы назвалі Народным сходам ці Народнымі сходамі?

— Не — не забаронена. Мала таго што правядзенне Народных сходаў не забаронена, дык па законе іх наогул нельга забараніць. Узгадайце Канстытуцыю: *"Грамадзяне прымаюць удзел у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця на рэспубліканскіх і мясцовых сходах".* Адначасова дзейнічае яшчэ закон "Аб рэспубліканскіх і мясцовых сходах", паводле якога Народныя сходы могуць праводзіцца на ўзроўні раёнаў, гарадоў, раёнаў у гарадах, а таксама мікраёнаў, жыллёвых комплексаў, кварталаў, вуліц, двароў, пасёлкаў, сёл і гэтак далей.

Дзеля падрыхтоўкі мясцовага Народнага сходу грамадзянамі могуць стварацца ініцыятыўныя групы, якія павінны сабраць у падтрымку сходу подпісы 10 працэнтаў жыхароў данай мясцовасці. У падпісным лісце павінны быць прастаўлены прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, адрас і асабісты подпіс грамадзяніна.

Паводле закона, ініцыятары самі вызначаюць дзень, час і месца Народнага сходу, а ўлады не маюць права яго забараніць ці не дазволіць.

— За любой ініцыятывай стаяць канкрэтныя людзі. І тут многае залежыць ад іх аўтарытэту ў грамадстве, у працоўных, навуковых, студэнцкіх і іншых калектывах. Скажыце, калі ласка, хто ўваходзіць у аргкамітэт па правядзенні Нацыянальных сходаў, якія заслугі гэтых людзей перад Беларуссю?

— У нацыянальны аргкамітэт і ва ўсе мясцовыя аргкамітэты (а сёння яны створаны ў 31 горадзе) уваходзяць сябры каманд усіх дэмакратычных кандыдатаў у прэзідэнты, якія падчас апошняй выбарчай кампаніі шмат зрабілі дзеля данясення да людзей праўды пра сённяшнюю ўладу. Адзін з сустаршынь аргкамітэта — **Генадзь Фядыніч.** Гэты паважаны чалавек больш дзесяці гадоў арганізуе працу незалежнага прафсаюза радыёэлектроннай прамысловасці, які, нягледзячы на ўсе цяжкасці, бароніць правы рабочых. А хто не ведае **Станіслава Шушкевіча,** які ўзначальваў Рэспубліку Беларусь у 1991—1994 гадах, і зараз актыўна адстойвае інтарэсы дэмакратычнай Беларусі за мяжой? У аргкамітэце актыўна працуе **Сяргей Калякін** і **Віктар Карнеенка,** якія арганізавалі і ўзначальвалі працу па назіранні за выбарамі, што дало магчымасць выявіць канкрэтныя факты фальсіфікацый. **Леў Марголін,** прадпрымальнік з Барысава, які шмат год удзельнічаў у арганізацыі барацьбы прадпрымальнікаў за свае працы. **Вінцук Вячорка** і **Вацлаў Арэшка** вельмі шмат рабілі і робяць дзеля развіцця незалежных няўрадавых арганізацый і ініцыятыў. **Зміцер Бародка** і **Яўген Афнагель** прыкладаюць немалыя намаганні для інфармавання людзей аб рэальнай сітуацыі ў краіне праз прэсу і сайт "Хартыя'97". Я сам пяць гадоў выдаваў газету незалежных прафсаюзаў "Рабочы", і за артыкул аб карупцыі ў Адміністрацыі прэзідэнта быў асуджаны з адбываннем пакарання на "хіміі".

— Ініцыятыва вылучана, многае робіцца, каб аб ёй ведала як мага большая частка грамадства. Але ж галоўнае — гэта непасрэдная арганізацыя Народных сходаў. Як вам бачыцца падрыхтоўка, правядзенне іх, скажам, у аддаленым райцэнтры, мястэчку, абласным цэнтры, у Мінску?

— Ініцыятары павінны стварыць ініцыятыўную групу, сфармуляваць патрабаванні да ўлад, сабраць пад імі подпісы 10 працэнтаў грамадзян свайго горада ці раёна ў горадзе, мікраёне, жыллёвага комплексу ці квартала, вуліцы, двара, пасёлка, сяла. Прызначыць месца і час сходу, праінфармаваць аб гэтым усіх жыхароў сваёй мясцовасці і 8 кастрычніка правесці Народны сход, на якім шляхам галасавання прыняць патрабаванні да ўлады.

— На любы збор людзей павінен быць дазвол мясцовай улады. Дайце тлумачэнне, як павінны звяртацца за такім дазволам арганізатары акцыі і якія дзеянні могуць быць з боку грамадскасці, калі не будзе дазволу на яе правядзенне?

— Як я ўжо сказаў, па законе ўлады не маюць права не дазволіць ці забараніць Народныя сходы. Арганізатары маюць права самі вызначаць дзень правядзення і месца сходу. Трэба толькі праінфармаваць улады аб гэтым за 15 дзён. Лепш за ўсё прызначаць сходы ў тых месцах, дзе адбываюцца акцыі, калі яны праводзяцца самімі ўладамі.

Вядома, улады могуць парушыць Канстытуцыю, законы, нават здаровы сэнс і паспрабаваць перашкодзіць правядзенню Народных сходаў, калі на іх прыйдуць дзясяткі ці нават сотні людзей. Але калі нас па ўсёй Беларусі будзе сотні тысяч, мільёны, ніхто не адважыцца перашкодзіць.

— Але ж вы ведаеце, якая інертнасць у многіх нашых людзей. Шмат хто кажа: "А што я магу? Ад мяне нічога не залежыць. Як Бог вырашыць, так і будзе!" Што вы маглі б сказаць такім людзям?

— Ёсць такая прытча. Адзін чалавек вельмі верыў у Бога. Аднойчы ў ягонай вёсцы пачалася паводка. Чалавек залез на дах свайго дома і пачаў маліцца. Вось вада паднялася ўжо да даху. Побач праплывае човен, і людзі клічуць чалавека: "Плыві разам з намі!" Чалавек адказвае: "Не трэба! Мяне Бог выратуе!" Вада ўжо па грудзі, зноў плыве човен і зноў чалавек адмаўляецца ў ім плысці. Вада ўжо па горла, зноў плыве човен і зноў чалавек адмаўляецца: "Мяне Бог выратуе!" Так і патануў чалавек. І вось ён трапляе да Бога. "Божа! — кажа чалавек, — чаму Ты мяне не выратаваў, я ж так у цябе верыў!" "Дурань! — кажа Бог, — я ж табе тры разы човен пасылаў, чаму ты не скарыстаўся?"

— У чытачоў "Народнай Волі" можа ўзнікнуць нямала іншых пытанняў. Якія каналы сувязі з каардынацыйнымі цэнтрамі па рэалізацыі ініцыятывы, звязанай з арганізацыяй Народных сходаў?

— З намі можна звязацца:
праз сайт
www.narodnyshod.org,
праз mail —
narodnyshod@gmail.com,
праз Skype — kate:liudvih,
па тэлефонах:
+375-29-77-44-968,
+375-44-71-60-622,
+375-29-68-15-737,
+375-25-95-14-003.

— Дзякуй, спадар Івашкевіч, за грунтоўныя тлумачэнні. Будзем спадзявацца, што вылучаная ініцыятыва знойдзе падтрымку ў грамадстве і пойдзе на карысць усяму беларускаму народу.

Гутарку вёў Сяргей КАЗЫРСКІ.

Сярэдні заробак «усох»

Як рапартуе Белстат, намінальны налічаны сярэднемесячны заробак беларусаў у чэрвені склаў 1 мільён 782,9 тысячы рублёў, павялічыўшыся ў параўнанні з маем на 8,1%.

Але калі перавесці гэтую суму ў долары, то заробак беларусаў па афіцыйным курсе Нацбанка (4960 рублёў за долар), складае 359 долараў, а па рэальным "чорным" курсе (6200) — толькі 287 долараў. Ад пераднавагодніх 500 "зялёных" засталіся толькі ўспаміны.

Валюту на оздоровление за рубежом «Беларусбанк» продает по остаточному принципу

В "Беларусбанк" за май-июль 2011 года за покупкой валюты на социально значимые цели обратилось более 5 тысяч человек, которым банк продал около 4,5 млн долларов в эквиваленте.

Как сообщает пресс-служба банка, есть практика продажи валюты и на оздоровление за границей, правда, выделение валюты в таком случае осуществляется по остаточному принципу. Об этом сообщается в пресс-релизе банка.

В "Беларусбанке" отметили, что решение принимается по каждому конкретному случаю и с учетом наличия подтверждающих предстоящие расходы документов.

Продажа валюты учреждениями банка осуществляется в безналичном порядке с зачислением на текущий, вкладной счет или карт-счет клиента с преимущественным последующим международным переводом иностранной валюты на задекларированную цель (т.е. на счета учреждений медицинской и образовательной сферы), в исключительных случаях валюта может быть выдана наличными.

Валюта продается по курсам, установленным в учреждениях банка на день осуществления операции.

Замежных турыстаў будуць вадзіць у Нацбанк як у музей

*Замежным турыстам, якія наведваюць Мінск, даступны экскурсійны маршрут "Мінск фінансава-дзелавы", паведаміла belta.by дырэктар дзяржаўнай установы "Інфармацыйна-турысцкі цэнтр "Мінск" **Алена ПЛІС.***

Падчас экскурсіі турыстам пакажуць Нацыянальны банк, Нацыянальную Акадэмію навук, Парк высокіх тэхналогій, БДЭУ і НВЦ "Белэкспа". Праграмай прадугледжваецца наведванне Музея грошай, што месціцца пры Нацбанку і дзе сабраны розныя экспанаты — ад манет ВКЛ да папяровых банкнот сучаснай Беларусі. Акрамя таго, экскурсійную групу могуць правесці ўнутр будынка Нацыянальнага банка Беларусі.

"Пакуль гэты экскурсійны маршрут недастаткова вядомы. Хоць, думаю, многім было б цікава, што ўяўляе сабой Мінск як фінансава-дзелавы цэнтр", — адзначыла дырэктар інфатурцэнтра.

ЗДАРЭННІ

Задыхнуліся ў каналізацыі

Два мужчыны задыхнуліся, спрабуючы пачысціць каналізацыйны калодзеж у вёсцы Гарадзец Кобрынскага раёна.

Як паведамілі БелаПАН у праваахоўных органах, няшчасны выпадак адбыўся 30 ліпеня. Трупы двух жыхароў райцэнтра былі выяўлены ў калодзежы ў двары дома аднаго з іх. Паводле папярэдняй інфармацыі, смерць наступіла ад асфіксіі газамі.

Адзін загінуўшы — 1965 года нараджэння, другі — 1957-га.

КВАРТИРНЫЙ ВОПРОС

Наталья НИЧИПОРОВИЧ, мать четверых близнят:

«Пока без жилья. Были предложения, но они нас не устраивали...»

Родители, которые долго мечтали о наследниках, хотят, чтобы их дети жили в нормальных условиях.

В декабре семья **Натальи Ничипорович** и **Владимира Колгушкина** прославилась на всю страну. Повод и впрямь был достойным. ***Впервые за 15 лет в Минске родилась четверня!***

Сегодня малышкам Марии, Дарье, Екатерине и Александре уже по семь месяцев, девочки чувствуют себя прекрасно и быстро растут. Родители, которые долго мечтали о наследниках, не могут нарадоваться на своих красавиц. Появиться малышкам на свет помог метод ЭКО. О том, что молодым родителям в скором времени стоит ожидать такого масштабного прибавления, узнали после визита к врачу. Узнали, обрадовались и стали готовиться к появлению в семье четырех "новобранцев".

О том, как сейчас поживает семья, которая в одночасье стала многодетной, "Народной Воле" рассказала Наталья — мама чудесных девочек. Разговор получился коротким, ведь все четыре барышни требуют постоянного внимания.

— Сейчас девочки растут, чувствуют себя хорошо, — поделилась Наталья. — *Только гулять долго не получается, потому что у них сейчас зубки режутся, капризничают.*

— Как справляетесь с нагрузкой? Все-таки четверо детей...

— Нормально, ведь нам выделили няню, которая помогает присматривать за малышками.

— Разрешился ли вопрос с жильем? Помнится, вы строили однокомнатную квартиру в Столбцах. Но вшестером там будет тесновато.

— Пока без жилья. Были предложения, но они нас не устраивали...

— А сейчас где живете?

— У моей мамы в поселке Колосово. Тут и родители помогают.

— Супруг в отпуске или трудится на благо большой семьи?

— Работает, за девочками ухаживаем я и няня. Мама моя помогает, когда нужно.

— В стране кризис, финансово тяжело поднимать сразу четырех младенцев?

— Пока нам всего хватает. Очень выручает бесплатное питание для девочек. Приходится тратиться на памперсы и одежду, но пока справляемся.

Наталья счастлива, что ей удалось стать мамой сразу четырех чудесных девочек. Внимание прессы спало, и на улицах поселка на родителей с четырьмя крохами обращают куда меньше внимания. Впереди у семьи Колгушкиных-Ничипорович еще много испытаний, но супруги уверены — вместе им все по силам.

Мария МАЛЕВИЧ.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Анатолий САВЕНОК, гендиректор БМЗ:

«Практически все планируемые показатели выполнены...»

Гендиректор РУП "Белорусский металлургический завод" Анатолий Савенок официально проинформировал об итогах деятельности БМЗ на первое полугодие.

"В последнее время в ряде средств массовой информации, в сети "Интернет" и других источниках часто стала появляться недостоверная информация о РУП "БМЗ", что наносит ущерб имиджу нашего предприятия перед зарубежными и отечественными партнерами, — *такое сообщение за подписью гендиректора на днях появилось на сайте БМЗ.* — Предоставляем Вам достоверную информацию о работе РУП "БМЗ" за 6 месяцев 2011 года.

	План	Факт
Темп роста производительности труда в сопоставимых ценах, %	106,0	108,5
Рентабельность продаж, %	12,0	12,0
Показатель по энергосбережению, %	-6,5	-6,5
Снижение уровня материалоемкости, %	-1,5	-8,6
Сальдо внешней торговли, тыс.долл.	369 103,1	272 842,5
Удельный вес инновационной продукции, (%)	20,5	23,0
Инвестиции в основной капитал, млн руб.	64 771	90 728
Показатель экономии ресурсов, к-т	0,999	0,911

В натуральном выражении объем отгруженной продукции составил 1 281 952 тонны, или 105,5% к аналогичному периоду прошлого года., в том числе:

	2011г.	в % к 2010г.
Литая заготовка и блюмы	248 743 т	(91,3%)
Прокат	756 288 т	(105,5%)
Трубы стальные	65 269 т	(128,9 %)
Металлокорд	49 959 т	(108,6%)
Бортовая проволока	17 325 т	(129,8 %)
Проволока РМЛ	22 093 т	(108,3%)
Проволока стальная	122 274 т	(127,4%)

Как видно из представленных данных, практически все планируемые показатели выполнены. А объемы отгрузки по продукции с высокой добавленной стоимостью превышают показатели за аналогичный период прошлого года. Считаем недопустимым публикации непроверенной и явно клеветнической информации в средствах массовой информации и сети "Интернет".

Мы всегда выступаем за честный и открытый бизнес!

Генеральный директор ПО "БМЗ" Савенок А.Н."

Информация об экономических трудностях, которые испытывает БМЗ, появилась пару недель назад в интернете. Сообщалось о задержаниях нескольких высокопоставленных бывших и нынешних менеджеров БМЗ.

— Ситуация развивается в таком ключе... — прокомментировал генпрокурор Григорий Василевич. *—Как бы это сказать... Криминальном, что ли... Определенные претензии к некоторым лицам есть, но давайте я пока таким комментарием ограничусь,* — сказал Василевич. *— В ближайшее время вы будете знать информацию по БМЗ, по некоторым должностным лицам, к которым есть вопросы у правоохранительных органов.*

ЗВОНОК В ГЕНПРОКУРАТУРУ

"Я пока не располагаю никакой информацией по БМЗ", — сказал в понедельник "Народной Воле" начальник Управления информации и связей с общественностью **Петр Киселев**.

Алина ВЕТРОВА.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
2 ЖНІЎНЯ 2011 г.

ОФИЦИОЗ

Борис БАТУРА:

«Жить надо красиво!..»

Председатель Минского облисполкома Борис Батура не жалуется на здоровье и по итогам года рассчитывает получить материальное поощрение за выполнение прогнозных показателей.

Об этом Борис Васильевич рассказал "Народной Воле" после пресс-конференции, посвященной подготовке Республиканского фестиваля-ярмарки "Дожинки-2011".

Эротический момент

Недавно в Молодечно случился небольшой скандал. Некоторые жители выступили против установки скульптуры "Папарацькветка", автор которой скульптор **Владимир Жбанов.** В народе композицию окрестили "Адам и Ева" и стали собирать подписи против скульптуры *"откровенно сексогенно-эротического характера".*

Борис Батура в курсе этой ситуации.

"Чтобы каждый человек был доволен — это, наверное, исключено, правда? — поделился он своими мыслями с журналистами. — *По той информации, которой я владею, собрали всего около ста подписей. А в Молодечно живет около ста тысяч жителей...*

Решение об установке такой композиции на фонтане не принимал я лично, а совет по монументальному строительству, который возглавляет уважаемый скульптор ***Иван Мисько****. Хотя я тоже "за" эту скульптурную композицию. Почему мы всё должны представлять в темных красках? Жить надо красиво! И почему в центре города — никого не хочу обидеть — обязательно должен стоять памятник Ленину?*

Конечно, люди по-разному относятся к тому, что делается. Я ведь в Молодечно каждую субботу бываю, хожу, с людьми беседую. На днях разговорился с двумя молодыми мамами с колясками. Я у них спрашиваю: "Как вы относитесь к тому, что сделано на площади?" Они говорят: "Не совсем хорошо. Раньше тут были ивы, мы под ними с детьми гуляли, а теперь..." Хотя через дорогу — парк, а эти ивы в любой момент могли обвалиться и придавить кого-то, и было бы несчастье. Но... Каждый имеет право на свое мнение, на свои замечания. И всех не убедишь. Мне, например, тоже не нравится, что я должен насаждать, что в Молодечно на каждом балконе должны быть цветы. Некоторые даже не пускали в квартиры, чтобы повесить им цветочницу! Но теперь меняются подходы, люди убеждаются, что это нормально, и что многоэтажка тоже может стать красивым уютным домом. Но я же не выхожу на сайты и не пишу, что вы такие-сякие, не хотите, чтобы там цветы были! Поэтому, что касается скульптуры, каждый имеет право на свое мнение, но этот вопрос уже практически решен, и не единолично, а после длительного обсуждения. Попытаться должен простой люд понять, что предложено, а не противостоять всему новому..."

Большая стройка

На подготовку к "Дожинкам" из республиканского бюджета выделено 80 миллиардов рублей.

"Кроме того, я благодарен всем министерствам и ведомствам за то, что они приводят в порядок объекты, находящиеся в их собственности, — говорит Батура. — *Привлечены некоторые средства и предпринимателей, на что они добровольно согласились, некоторые даже сами проявляют инициативу. Ну хотя бы по тем же цветочницам — это они закупили на весь город цветочницы, которые теперь мы вместе с цветами насаждаем (плохое слово) городу".*

Пока Молодечно — это сплошная строительная площадка.

"*Все, что задумали, мы доведем до конца,* — обещает председатель Миноблисполкома. — *Мы жестко экономим. И подрядчикам сказано, что все должны вкладываться в первоначальные суммы, которые определены по проектно-сметной документации. Но практически все закоулки Молодечно приводятся в порядок. Сокращения объемов работ на сегодняшний день нет".*

Некоторые жители обеспокоены тем, что во время стройки в городе вырубили немало деревьев.

"Около полутора тысяч деревьев мы посадили, — говорит Батура. — *Вырубили то, что должно было упасть. И в подтверждение моих слов последний ураган в Молодечно еще 60 деревьев положил. Поэтому я дал задание еще внимательнее посмотреть — там в парке остались наклоненные березы. Конечно же, мы высадили новые деревья, и дальше будем высаживать. Так же, как и цветы".*

По словам "губернатора" Минщины, принято решение высаживать в области деревья диаметром не менее 8 сантиметров — чтобы лучше приживались.

"Все, что сейчас делается в Молодечно — делается на века, — убежден Батура. — *Это не только красота, это благо для людей, это удобство проживания, это среда обитания".*

В ожидании карнавала

Сценарий "Дожинок" еще должен утвердить А.Лукашенко.

"Но наша задумка — чтобы главное действо произошло в амфитеатре, рассчитанном на 2600 мест, там удобная сцена для артистов, — говорит Батура. — *Само шествие должно быть похоже на карнавал: красочное, радостное, с акцентами нашего белорусского фольклора, танцы, пляски. Не техника должна быть главной, а люди и наша культура.*

Будут ли приглашены на "Дожинки" российские звезды, Батура не уточнил. *"Мы пока прорабатываем эти вопросы,* — говорит он. - *Постараемся сделать так, чтобы юбилейные, 15-е, "Дожинки" остались в памяти надолго, чтобы они выгодно отличались от всех предыдущих и по сценарию, и по многим другим подходам. Все будет сделано для того, чтобы гости чувствовали себя уютно и празднично".*

ЛОЖКА ДЕГТЯ

Александр ЯРОШУК:

«Надо быть сумасшедшим, чтобы прогулять часть того, что выращено...»

Первый заместитель председателя Минского облисполкома в 1996—1998 годах, а ныне — член Общественно-консультативного совета при Администрации президента, председатель Белорусского Конгресса демократических профсоюзов Александр Ярошук называет "Дожинки" глупым праздником.

— Я считаю, что это совершенно надуманный праздник, — *сказал Ярошук "Народной Воле".* — Я не скрывал своего резко отрицательного отношения к нему и когда работал в органах власти. С моей точки зрения, это просто показуха. Выбирают какой-то город, где будут праздновать, приводят его в порядок, а все остальные, получается, обделяют. Причем зачастую качество того, что делается, тоже очень сомнительное...

Даже в советское время не было такой традиции, хотя сельское хозяйство и тогда было любимой игрушкой партийно-советских вождей. В принципе, праздники типа "Дожинок" — это традиция авторитарных режимов. Например, Муссолини тоже устраивал всевозможные праздники урожая и сам не вылазил с полей. Что-то подобное происходит и у нас.

Уборка урожая — это абсолютно нормальная работа, в других странах она столько внимания не привлекает. И выпячивать каким-то образом, дескать, такие-то бойцы спасли урожай, обеспечили продовольственную безопасность страны... В течение года работало ведь огромное количество людей, не только механизаторы.

Мне приходилось возить этих победителей-механизаторов, я помню, как скованно они себя чувствовали на этом празднике. Мне было жаль, что они являются атрибутом, декорацией дешевого спектакля под названием "Дожинки". Многие раскрепощались и оживлялись только после того, как рюмку возьмут. Эти люди произносят дежурные речи, заученные слова, заранее прописанные в сценарии. Мне их жаль...

Думаю, как только наступят демократические перемены, этот праздник сам собой пропадет. Ибо никогда такого не было, чтобы хозяин, собрав урожай, на радостях пропил и прогулял часть того, что выращено... Это нужно быть сумасшедшим...

ДЕТАЛИ

О дорогой машине Константина Сумара

Не так давно интернет всколыхнула новость о том, что в разгар кризиса глава Брестской области **Константин Сумар** сменил внедорожник Toyota Land Cruiser на черный седан Audi A8 L, стоимость которого около 100 тысяч евро.

Может, и Батура к "Дожинкам" намерен сменить служебное авто?

"Я езжу на джипе, причем когда пришел в Миноблисполком, он уже был, - рассказал "Народной Воле" Борис Васильевич. — *А купите новое авто — приеду на новом. Но я бы хотел еще в поддержку Сумара сказать. Ему до Минска ехать больше трехсот километров. Ну что, председатель облисполкома не заслуживает машины? Да, у него был джип, но на джипе такие расстояния все-таки тяжело преодолевать... Ну и возраст (хотя он, конечно, молодой, но тем не менее). Пожалели бы человека... Уже надо было так издеваться над ним!.."*

НА ХОДУ

Батура в отставку пока не собирается

Три года назад, когда Бориса Батуру избрали (или назначили) председателем Совета Республики, гомельский "губернатор" **Александр Якобсон** с завистью отметил: *"Батура такой импозантный мужчина, что у женщин при виде него дыхание учащается".*

В последнее время про Батуру ходят другие разговоры: мол, после "Дожинок", скорее всего, уйдет в отставку по состоянию здоровья...

— Вид усталый, говорите?.. А это телевизор портит. Искажает... — *сказал "Народной Воле" Батура, пешком спускаясь с четвертого этажа из Национального пресс-центра.*

— Значит, со здоровьем все в порядке? А то писали, будто и из Совета Республики вы из-за здоровья ушли...

— Из Совета Республики по здоровью?! Это с должности председателя облисполкома можно уходить по здоровью, а не из Совета Республики...

— Согласна, там почти курорт...

— Нет, на здоровье, слава Богу, не жалуюсь.

— А на зарплату? Сейчас все жалуются...

— А чего жаловаться? Надо зарабатывать, крутиться.

— Но у вас же, видимо, крутись-не крутись — фиксированный оклад?

— Почему? В этом году правительство приняло постановление по бонусам для руководителей государственных организаций, вот закончим год, выполним производственные показатели, обеспечим динамичное развитие региона и, я думаю, что-то будет — прибавка или премия...

— Оптимистично, однако...

— Ну а как иначе?..

Марина КОКТЫШ.

Зборная Беларусі трапіла ў пекла

У Рыа-дэ-Жанэйра прайшла жараб'ёўка адборачных груп да чэмпіянату свету, які пройдзе ў 2014 годзе ў Бразіліі.

Беларускія футбалісты трапілі ў адну групу з чэмпіёнамі свету зборнай Іспаніі, зборнымі Францыі, Фінляндыі і Грузіі.

Групу I, куды трапілі беларусы, футбольныя спецыялісты пасцяшаліся ахрысціць "групай смерці". Маўляў, прабіцца на чэмпіянат свету ў кампаніі такіх моцных сапернікаў, будзе вельмі няпроста.

Праўда, галоўны трэнер беларускай каманды Бернд Штанге захоўвае алімпійскі спакой пасля вынікаў жараб'ёўкі.

"Наша група — самая цяжкая з усіх, — адзначыў ён. - Жараб'ёўка вызначыла нам у сапернікі двух грандаў — Іспанію і Францыю. Я размаўляў з Ларанам Бланам (галоўны трэнер зборнай Францыі. — **Аўт.**), ён — у шоку. А я — не. Наадварот, адчуваю сябе спакойна. Так, змагацца з Іспаніяй і Францыяй будзе цяжка. Але нікога не трэба баяцца. Прыезд у Беларусь такіх каманд стане падарункам для балельшчыкаў".

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Пад Віцебскам на вучэннях загінуў дэсантнік

Здарэнне адбылося на возеры Скрыдлева недалёка ад Віцебска.

Вайсковец 103-й гвардзейскай асобнай мабільнай брыгады патануў падчас начных трэніровачных скачкоў. Здарэнне адбылося на мінулым тыдні. Цела 23-гадовага дэсантніка вадалазы знайшлі толькі ў нядзелю, паведамляюць "Народныя навіны Віцебска".

Падчас вучэнняў дэсантнік прызямліўся ў возера. Па расповедах калег, загінуўшы быў камандзірам узвода і выдатным плыўцом. У вадзе ён ужо амаль вызваліўся ад парашута. Але потым штосьці перашкодзіла яму выратавацца, хоць да берага было зусім блізка...

СПРАВЫ СЯМЕЙНЫЯ

Данік Саннікаў паехаў адпачываць у Лондан

Паколькі яго тата ў турме, а мама Ірына Халіп невыязная, 4-гадовага Даніка возяць на адпачынак бабулі і дзядуля.

За час, пакуль бацькі Данькі Саннікава знаходзіліся ў турме і пад следствам, гэты хлапчук стаў сапраўднай зоркай, героем навін. За яго лёсам сачылі ўсе — ці не забяруць Даньку ў дзіцячы дом, ці аформяць апякунства на бабулю Люцыну Бяльзацкую, якой ужо за семдзясят? Апякунства афармілі. А потым да Данькі вярнулася мама — Ірына Халіп. Спачатку пад хатні арышт, цяпер яе статус — падпіска аб нявыездзе. Таму на адпачынак Даньку возяць бабулі і дзядуля. Месяц таму Данік Саннікаў пабываў у Алушце з бацькамі Ірыны, Люцынай Бяльзацкай і Уладзімірам Халіпам, перадае "Еўрарадыё".

"На жаль, я сама не магу з'ездзіць з уласным сынам на адпачынак, таму што я невыязная, — гаворыць Ірына Халіп. — *Таму цяпер ён са сваёй другой бабуляй, Алай Уладзіміраўнай Саннікавай, едзе ў госці да Ірыны Багданавай, сястры майго мужа Андрэя. Ірына ўжо 20 гадоў жыве непадалёк ад Лондана, яна запрасіла іх у госці. Данік вельмі любіць "даблдэкеры" — гэтыя двухпавярховыя аўтобусы. Ён бачыў іх на карцінках, але ніколі не катаўся. І гэта яго мара — пакатацца на "даблдэкеры"!.. Акрамя таго, ён вельмі любіць прыгоды маленькага цягнічка Томаса. А ў Лондане якраз адбываюцца адмысловыя экскурсіі з Томасам!.. Я думаю, Даніку там будзе цудоўна, Але Уладзіміраўне таксама. Тым больш што яны якраз сустрэнуць дзень народзін Ірыны Багданавай разам. Шкада толькі, што Андрэя не будзе..."*

Бацькі Ірыны Халіп з унукам і дачкой. *Фота "Еўрарадыё".*

IN MEMORIA

Ядвига ГРИГОРОВИЧ:

«Я счастливый человек...»

В минувшие выходные умерла бывший ректор Университета культуры Ядвига Григорович. Она признавалась, что муж частенько ревнует ее к работе, и стремилась быть похожей на свой идеал — Наину Ельцину.

В 65 лет Ядвига Григорович больше не могла сопротивляться болезни и ушла из жизни, оставив яркий след в сердцах родственников, друзей, студентов и коллег.

Ядвига Доминиковна вырастила не одно поколение студентов, гордых тем, что выбрали именно ее вуз. Активная женщина всегда умела находить выход из сложных ситуаций и сглаживать острые углы. Не менее важной чертой, особенно необходимой при работе ректора, многие считали ее умение быть открытой для нового.

"Когда меня спрашивают о самой большой удаче в жизни, вспоминаю, как мы с моим 11-летним сыном были на Домбае, — рассказывала журналистам о себе Ядвига Григорович. — *Тогда еще недорого стоило поехать покататься на горных лыжах. И за два дня до отъезда у нас осталось всего три рубля — не рассчитали! "Не горюй, мама!" — сын взял последние деньги и пошел в зал с игральными автоматами. Через полчаса приходит с полной шапкой монет! Благополучно добрались до дома, а там он еще купил мне два тюбика крема для лица... Кажется, большей удачи в жизни не было! Я счастливый человек — семьей, работой, которая требует молодости и бодрости духа".*

Ядвига Доминиковна умела сочетать в себе абсолютно разные черты и привычки. Занимая руководящий пост в Белорусском государственном университете культуры и искусств, она всегда оставалась хорошей хозяйкой, женой, мамой.

"Если бы у меня был другой менталитет, я могла бы завести в доме служанку, — рассуждала бывший ректор. — *Она ходила бы в магазин, готовила еду, — наверное, мне было бы легче. Но я не могу представить, как это чужой человек будет ходить по моему дому, заглядывать в мой холодильник!"*

Ее супруг — генерал **Владимир Егоров** в свое время занимал пост министра внутренних дел, но всегда честно признавался, что свободное время предпочитает проводить с женой. Ради нее он даже отказывался от любимой охоты.

"Когда ты должностное лицо, вся твоя жизнь подчиняется распорядку учреждения, которому служишь, — признавалась в одном из интервью Ядвига Доминиковна. — *Сессия, каникулы — и в университете, и у меня. Наверное, муж немного ревнует меня к университету, но и болеет за него не меньше, чем я. К тому же должности у него всегда были выше моих. Уже в 18 лет у него в трудовой книжке была запись: "Директор дома культуры"! Вместе с тем я очень домашний человек. Невероятное наслаждение испытываю, наблюдая, как растут перцы, огурцы. Обожаю запах помидорной ботвы, люблю ухаживать за моими розами, лужайкой, альпийской горкой. Это мое богатство".*

С должности ректора ей пришлось уйти еще в 2007 году. Болезнь отнимала слишком много сил, хоть до последнего она старалась быть справедливым руководителем. Тогда ее коллеги плохо представляли, как университет будет существовать без своего бессменного ректора. Она умела работать с людьми, вселять в них уверенность, делиться частью своего оптимизма.

"Горжусь своей фамилией, хотя я не дочь знатных особ, отец работал в колхозе, мать была сельским библиотекарем, — вспоминала Ядвига Григорович о своих корнях и о молодых годах. — *Когда писала диссертацию по творчеству Купалы, работала в архивах, с удивлением обнаружила, что фамилию Григорович носили знаменитые фольклористы, художники, музыканты, историки... И подумалось, может, и мне она досталась не случайно? Признаюсь, учась в Москве, эту фамилию иногда использовала в "корыстных" целях... Так же как, приходя в Большой театр, протягивала красную книжечку с надписью АПН (что означало "Академия педагогических наук", но в то время существовало и Агентство печати "Новости"!). Благодаря ей посмотрела немало спектаклей".*

Мария МАЛЕВИЧ.

ИЗ ЛИЧНОГО ДЕЛА

Григорович Ядвига Доминиковна

Родилась 24 августа 1946 года в деревне Доманово Бобруйского района.

В 1969 году закончила литературно-музыкальный факультет Минского государственного педагогического института им. А.М.Горького. С 1974-го по 1982 год — старший научный сотрудник Научно-исследовательского института педагогики Министерства образования БССР, а с 1982 года она получила должность заведующей отделом этого же института.

С 1982-го по 1990-й — доцент кафедры психологии и педагогики Минского института культуры. С ноября 1992-го по декабрь 2007 года — ректор Белорусского государственного университета культуры и искусств.

В 2000 году была избрана членом Совета Республики. С 2000-го по 2004 год работала заместителем председателя Комиссии по социальным вопросам.

РАЗВІТАЛЬНАЕ СЛОВА

Генадзь БУРАЎКІН: «Дзякуй, Ядвіга Дамінікаўна!»

— Калі Ядвіга Дамінікаўна сышла з універсітэта, гэта, думаю, была страта не толькі для педагогаў і студэнтаў, гэта была страта для ўсёй беларускай культуры, — *сказаў у інтэрв'ю сеткавай газеце "Салідарнасць" паэт Генадзь Бураўкін.* — Тое, што яна сышла з універсітэта і яе напаткала вельмі цяжкая (і, як аказалася, невылечная) хвароба, для мяне было двайною бядою. Не толькі чалавечнай, але і грамадскай. Не скажу што блізка, але мы былі добра знаёмы. Я даражыў тым, што мы можам адкрыта, без аглядкі гаварыць з ёю аб праблемах нацыянальнай культуры. Мне вельмі шкада, да болю шкада, што яе больш з намі не будзе.

На развітанне мілай, слаўнай Ядвізе Дамінікаўне хачу сказаць дзякуй — дзякуй за тое, што яна паспела ў сваім жыцці зрабіць. І хачу папрасіць у яе прабачэння за тое, што мы не далі ёй разгарнуць ва ўсю магутнасць свой талент, веды на карысць роднай любімай Беларусі, якой яна служыла ўсё сваё яркае і прыгожае жыццё.

ДЫСКУСІЯ

Уладзімір КУЛАЖАНКА,
доктар эканамічных навук,
прафесар

Не, Беларусь не «крохотная» дзяржава...

Прачытаў у "Народнай Волі" за 24—27 чэрвеня невялікую заметку С. Аляксандрава пад загалоўкам "В нашей маленькой стране беспорядков, как в большой". Аўтар правільна ставіць пытанне аб тым, што ў нас няма рынку і рыначнага механізму рэгулявання эканомікі, няма нават адпаведных дзейсных законаў, характэрных для рыначнай эканомікі. Гэта трэба стварыць. Але разам з тым аўтар выказвае эканамічна памылковае меркаванне па праблеме курса рубля і структуры народнай гаспадаркі. Асабліва ўзрушыла мяне тое, што аўтар называе нашу краіну "крохотной".

Мала таго, што такое вызначэнне абражае беларусаў, яно ў дадатак скажае рэчаіснасць. Беларусь ніколі не была малюсенькай краінай. Яе тэрыторыя ў часы Вялікага Княства Літоўскага дасягала 900 тысяч квадратных кіламетраў. Але і зараз яе тэрыторыя не малая — 200 тысяч квадратных кіламетраў. Якая гэта "малюсенькая краіна", калі па яе тэрыторыі працякае шэсць судаходных рэк: Прыпяць, Сож, Бярэзіна, Днепр, Заходняя Дзвіна, Нёман і мноства невялікіх рэчак. Чатыры ракі адносяцца да Чарнаморскага басейна і дзве — да Балтыйскага. Водападзел паміж гэтымі рэкамі займае вялікую плошчу, чаго не можа быць у малюсенькай краіне.

Плошча Беларусі дае падставы лічыць яе сярэдняй краінай. Па плошчы яна займае 11-е месца ў Еўропе пасля Румыніі. Астатнія 34 краіны Еўропы меншыя за Беларусь, некаторыя ў разы. І гэта пры тым, што этнічная тэрыторыя Беларусі значна большая. Яна амаль роўная сучаснай Польшчы ці Італіі. Ды так склалася ў гісторыі нашай краіны, што Беларусь страціла свае землі. Не будзем закранаць падзеі трохсотгадовай даўніны. Паглядзім, што адбылося за апошняе стагоддзе. У 1919 годзе ў Смаленску была абвешчана Беларуская Рэспубліка, куды ўваходзілі Смаленская, Віцебская, Магілёўская і Гродзенская вобласці. Затым у 1920 годзе Расія адрэзала Смаленск, Віцебск, Полацк, Магілёў, Гомель і Мазыр і далучыла да сваіх тэрыторый. Беларусь апынулася ў абрэзаным стане. У яе пасля Рыжскай дамовы засталася толькі Мінская вобласць плошчай 56 тысяч квадратных кіламетраў. Пачаліся шматгадовыя і настойлівыя хадайніцтвы перад Масквой аб вяртанні нашых зямель. Толькі ў 1924 годзе былі вернуты Віцебск, Полацк, Магілёў, а праз два гады і Гомель з Мозырам. Смаленск не быў вернуты, хоць там пражывала беларускае насельніцтва і да 1937 года былі беларускія школы. Некаторыя былыя паветы Віцебскай і Магілёўскай абласцей таксама былі адрэзаны ад Беларусі Расіяй. Ад Віцебскай вобласці быў забраны Невельскі павет, які адышоў да Пскоўскай вобласці. Прычына ў тым, што Расія хацела мець непасрэдную мяжу з Латвіяй.

Абразанне тэрыторыі Беларусі адбылося і падчас Другой сусветнай вайны. Беларусь — адзіная у Еўропе краіна, якая ў якасці пераможцы згубіла частку сваёй тэрыторыі. У 1943 годзе на Ялцінскай канферэнцыі Сталін аддаў Польшчы Беластоцкі рэгіён, населены беларусамі. Каб замацаваць акупацыю Літвы і Латвіі і іх уваходнасць у Саюз, Сталін аддаў Вільню жамойтам, а Дзвінск, які быў другім па памеры горадам у Вялікім Княстве Літоўскім, аддаў Латвіі. Зараз гэта Даўгаўпілс, які па колькасці насельніцтва займае ў Латвіі другое месца пасля Рыгі.

Беларусь не малюсенькая краіна і па колькасці насельніцтва. На яе землях пражывае зараз 9,4 млн чалавек. Каб не войны, падчас якіх насельніцтва ў Беларусі знішчалася, беларусаў было б у разы болей. Так, падчас так званай "невядомай вайны" Расіі супраць Літвы (так называлася тады наша краіна) 1655—1667 гг. акупанты рабавалі наш народ і вынішчылі 52 працэнты ўсяго насельніцтва краіны. Ды апроч гэтага ў Маскоўю было выгнана 300 тысяч чалавек. Цар Аляксей Міхайлавіч загадаў у кожным населеным пункце арганізаваць прысягу насельніцтва цару. Прысягнуўшых называлі беларусцамі. Адсюль і ўзнікла перайменаванне нашага народа з ліцвінаў у беларусы. Не выпадкова, што ў нас захаваліся прозвішчы, якія нагадваюць той час. У г.п. Дзівіне Кобрынскага раёна я сустракаўся з адным селянінам, прозвішча якога Беларусец.

Вялікія страты ў сваёй колькасці панёс беларускі народ падчас Паўночнай вайны са шведамі на пачатку XVIII стагоддзя. А затым у час Першай сусветнай вайны і асабліва падчас Айчыннай вайны 1941—1945 гг., калі фашысцкія агрэсары знішчылі трэць насельніцтва Беларусі.

З усяго сказанага вынікае, што наша краіна, каб не стаць "малюсенькай", павінна берагчы свае землі і настойліва павялічваць колькасць свайго насельніцтва. Такія-сякія меры ў гэтым плане прымаюцца нашай дзяржавай. Аказваецца матэрыяльная дапамога маладым сем'ям на ўтрыманне дзяцей, выдаюцца льготныя крэдыты шматдзетным сем'ям на жыллёвае будаўніцтва і г.д. Але гэтых мер недастаткова. І галоўнай праблемай з'яўляецца жыллё. Маладым сем'ям узбіцца на ўласную кватэру вельмі цяжка. А для тых, якім удаецца пабудаваць, невыносна цяжка пагашаць крэдыты. У гэтай справе трэба штосьці рашаць. Настаў час па прыкладзе Расіі ўвесці практыку выдачы шматдзетным сем'ям сямейнага капіталу.

Трэба ўсямерна развіваць культуру беларускага народа, пра што нядаўна на Купаллі ў Александрыі гаварыў А.Лукашэнка. Толькі як можна развіваць беларускую культуру без нацыянальнай мовы? Пра гэта нацыянальны лідар звычайна маўчыць. Больш за тое, А.Лукашэнка неаднаразова ўжывае зняважліва абразлівае словазлучэнне "нашы свядомыя" ў дачыненні да тых, хто змагаецца за беларусізацыю. Прыкра становіцца на душы, калі бачыш, як прэзідэнт Беларусі "шпарыць па-руску" пры сустрэчы з замежным госцем.

Паглядзіце, ні беларускі прэзідэнт, ні ўрад, ні суды, ні войска, ні міліцыя — ніхто не выкарыстоўвае мову тытульнай нацыі. Цікава, які гэта каланізатар адбірае ад беларускага народа мову сёння? (Дзякуй Паўлу Латушку, які любіць Радзіму, любіць родную беларускую мову і так прыгожа і змястоўна ёю карыстаецца.)

Тэрыторыя і колькасць насельніцтва, безумоўна, вызначаюць, якая гэта краіна: вялікая, сярэдняя ці малая. Але галоўным пакачыкам статусу краіны з'яўляецца ўзровень эканамічнага развіцця. Вось, напрыклад, Бельгія па тэрыторыі (30 тыс. кв. км) маленькая краіна. Але там пражывае 10,5 млн чалавек. А аб'ём ВУП (валавога ўнутранага прадукту) дасягае 322 млрд доляраў. У разліку на чалавека больш за 30 тысяч доляраў. Дык ці можна назваць гэтую краіну малюсенькай? Безумоўна, не. Ці вось другі яскравы прыклад. Аўстрыя мае невялікую тэрыторыю — 83,9 тыс. кв. км. Там пражывае 8,2 млн чалавек. І па тэрыторыі, і па насельніцтве ўступае Беларусі. Але па вытворчасці ВУП (269,8 млрд доляраў) у 3,5 раза пераўзыходзіць нас. На чалавека там прыпадае больш за 32.500 доляраў. Дык які статус гэтай краіны? Канешне, гэта сярэдняя краіна.

Беларусь па тэрыторыі і па насельніцтве — сярэдняя краіна. А вось па ўзроўню развіцця эканомікі наша краіна, на жаль, невялікая. Нам трэба ўтрая павялічыць вытворчасць ВУП, каб выйсці на сярэднееўрапейскі ўзровень. Дасягнуць такога прыросту не проста. Парады вышэй згаданага аўтара С.Аляксандрава адносна грашовага абарачэння не могуць садзейнічаць эканамічнаму росту. Ігнаруючы значэнне валютнага курса, аўтар піша: "Я разумею валютную палітыку так: прадаў тавар за бугор — май чужую валюту, прадаў у сябе — сваю. І развівайся". Між тым развіццё магчыма пры нармальным, справядлівым валютным курсе. Бо без гэтага прадпрыемствы не змогуць выплачваць заработную плату. Без нармальнага валютнага курса нельга весці прыбытковы знешні гандаль. Менавіта адным з наступстваў завышанага курса рубля ў першым квартале бягучага года дэфіцыт гандлёвага балансу склаў звыш за 3 млрд доляраў. А ўжо ў чэрвені, калі валютны курс рубля абваліўся аж на 56%, гандлёвы баланс стаў прыбытковым аж на 120 млн доляраў. З гэтага вынікае, што за валютным курсам трэба сачыць прафесійна і не дапускаць практыкі: "Пакуль я буду старшынёй Нацбанка, валютны курс не знізіцца".

Безумоўна, каб забяспечыць эканамічны рост і выйсці з таго абмежаванага ўзроўню, калі краіна атрымлівае толькі 70 млрд доляраў ВУП, трэба замяніць дзяржаўнае рэгуляванне рыначным механізмам. Найперш змяніць практыку цэнаўтварэння. Яна ў нас дзяржаўная. Павысіліся ў магазіне цэны — дзяржава тут як тут. Цэны валявым шляхам зніжаюцца працэнтаў на 5—9, хоць павысіліся яны на ўсе 30%. Як рэагуе на гэта вытворчасць? Ніяк, усё ідзе, як ішло. А пры рыначным механізме, калі павышаюцца цэны, то гэта сведчыць аб адставанні прапановы тавараў у параўнанні з попытам. Адразу ўключаюцца новыя вытворцы. Прапанова расце, цана зніжаецца да ўзроўню, які прымальны як для вытворцаў, так і для спажыўцоў. У гэтых умовах канкурэнцыя выконвае сваю станоўчую ролю. У нас канкурэнцыі, асабліва ў прамысловасці, амаль няма, існуе праблема прыватызацыі, скіраванай на перадаоленне дзяржаўнай манаполіі. У Расіі, па закліку прэзідэнта Д.Мядзведзева, пачалася дзейнасць па ліквідацыі долі дзяржавы ў вытворчых фондах прадпрыемстваў. Мэта — развязаць рукі ў вытворчасці, даць магчымасць канкурэнцыі рэгуляваць цэны. Трэба ісці па прыкладзе Расіі. Але ў нас пакуль што не хапае нацыянальнага капіталу ў прадпрымальнікаў. Прадаваць прадпрыемствы замежным алігархам нельга. У гэтым плане недарэчна гучыць прапанова С.Аляксандрава. Ён піша, што калі патрэбны прапановы па навядзенні парадку ў эканоміцы, то калі ласка: "Трэба прадаць 50% прадпрыемстваў Расіі. А на атрыманыя грошы арганізаваць вытворчасць "ё-мабіляў", можна ў кааперацыі з расіянамі". Што можна сказаць аб гэтай прапанове? Поўная здрада Беларусі і ператварэнне яе ў "малюсенькую" дзяржаву, якой ён лічыць Беларусь сёння.

Са сказанага вынікае адно — усё грамадства Беларусі павінна змагацца за эканамічны рост, удасканальваць гаспадарчы механізм, пашыраць дэмакратыю, спыніць пераслед свабоднага друку. Усё павінна рабіцца дзеля таго, каб Беларусь стала сярэдняй дзяржавай у Еўропе не толькі па памеры тэрыторыі, колькасці насельніцтва, але і па ўзроўні эканамічнага развіцця. Дзеля гэтага нам трэба за бліжэйшыя 10 год давесці вытворчасць ВУП да 250—300 млрд доляраў. Працавіты народ Беларусі здольны гэта дасягнуць.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Хапун

Падобна, што да міліцыянтаў, якія хапаюць людзей на вуліцах і плошчах, даведзены план па затрыманых. Інакш чым можна растлумачыць тое, што музыканта Аляксея Балашова разам з жонкай "згрэблі" каля касы ў магазіне, дзвюх дзяўчат выцягнулі з кавярні, трох падлеткаў закінулі ў аўтобус, калі яны пасля гульні ў футбол ішлі ў магазін па ваду?..

Міліцыянтаў Грышку й Саўку
Чыхвосціў грозны капітан:
— Вы заўтра пойдзеце ў адстаўку,
Бо не выконваеце план!
Якую ставіў я задачу?
Схапіць на плошчы дзесяць "цел".
А вы мне толькі дзеда-клячу
Прывалаклі
У райаддзел.
Дык вось, я на хапун чарговы
Даю вам гэтакі нарад:
На трох хлапцоў надзець аковы
І зацугляць дваіх дзяўчат.
Каб людзі бачылі і чулі,
Што кожны з вас сапраўдны мент,
Дзесь прыхапіце і бабулю —
Хай будзе ўвесь асартымент.
Калі ж здабычы будзе з лішкам,
Магчыма, дам вам медалі...
У дзень пагодны Саўка з Грышкам
На плошчу паляваць пайшлі.
Не так даўно падчас разгонаў
Дубінкі мелі і шчыты.
Цяпер жа не было пагонаў:
Хай думаюць, што ты — не ты...
Загад суровы капітана
Зусім не просценькі такі:
"Мянты" другія апантана
Там палявалі, як ваўкі.
Тых дэманстрантаў — кот наплакаў,
А іх, "мянтоў", такая раць!..
Да беззаконных аўтазакаў
Амаль няма каго цягаць.
Не прыгадзіліся аковы
І не выконваецца план...
І заўтра капітан суровы
Пакліча знoўку "на дыван"...
І тут ідэя ўзнікла ў Саўкі:
— Давай хапаць каго не след.
Павяжам дзеда для затраўкі.
Вунь, на прыпынку, бачыш — дзед...
З ім валтузні было нямнога.
Заехаўшы яму ў "пятак",
Сябры засунулі старога,
Ды не ў трамвай, а ў аўтазак.
Затым усё — як па праграме,
Адразу быў трафей другі:
Прылюдна ў недалёкай краме
Мужчыну вырвалі з чаргі.
Аднак жа ён — не перастарак,
Сапраўдны трапіўся мацак!
Прыйшлося надаваць у карак,
Перш чым загнаць у аўтазак.
А з дзеўкамі было не гэтак,
Праблем не мелася зусім.
Іх у кавярні — нібы кветак,
Як кажуць, хоць касой касі.
Таму і быў улоў багаты,
Цягалі дзевак пакрысе,
Хаця яны, як парасяты,
Пры гэтым верашчалі ўсе.
Калі ўжо плана дасягнулі
І быў у іх узнёслы стан,
Успомніў Грышка:
— Нам бабулю
Схапіць загадваў капітан!
Увесь квартал аббегаў Саўка,
Ды не сустрэў нідзе бабуль.
І нават у дварах на лаўках
Іх, векавечных, — поўны нуль.
І тут (дальбог, адно пасмешча)
Усклікнуў Грышка:
— Дурань я!
Бабуля — ёсць! І гэта — цешча
Мая!
Такая ўжо змяя...
Яе, каргу, трываю ледзьве...
Мы зробім план, а заадно
"Уставім клізму" гэтай ведзьме...
Пра гэта марыў я даўно!
Не дасць, магчыма, хтосьці веры,
Так і зрабілі!
І калі
Яе выцягвалі з кватэры,
Чамусь суседзі не раўлі.
Старую ім было не шкода,
І ў тым не бачылі бяды,
Бо цешча "ворагам народа"
Была, прызнаца, сапраўды.

***

Калісьці ў трыццаць сёмым годзе
Таксама быў такі ж хапун.
І ў магаданскім снезе-лёдзе
Людзей закопвалі без трун.
Народ бяспраўны і збалелы
У бездань чорную паўзе...
Няўжо ГУЛАГі і расстрэлы
За даляглядам на чарзе?

РЕБРОМ

Трехпроцентная радость,

или За «скидку» сказала б спасибо, если бы ее можно было заметить

Здравствуйте, редакция любимой газеты!

Пишет вам многодетная семья из Минска. Может быть, вы подскажете, какому "мудрецу" пришло в голову так облагодетельствовать нас, что остается только руками развести? И возмутиться.

Вот одарили нас, многодетных, скидкой аж в 3 процента на покупки в продмагах. Пока не разберешься на деле, что это такое, хочется кричать ура!. Это ж надо, в трудные времена государство о нас, наших детках печется!

Но вот пошла я, мать большого семейства, в универсам (Торговый центр "У кургана" по ул.Любимова), купила продуктов на 85.830 рублей — и получила скидку... 110 белорусских рублей (чек прилагается к письму). По-моему, тут и трех процентов нет. И для этого нужно было предъявить паспорт и удостоверение, чтобы — не дай Бог! — не сорвать такой соблазнительный куш из госбюджета! Какой же надо иметь безмерный кошелек, чтобы почувствовать эту трехпроцентную радость?

Кассир Макась Л.К. 12/07/2011 11:13:42
Чек №792153(Касса №10) КОЛ ЦЕНА СУММА

ТВОРОГ ЗЕРНЕНЫЙ КРОШЕЧКА 5	1.000	1'840	1'840	13
ХЛЕБ ТОСТОВЫЙ КЛАССИЧЕСКИЙ	1.000	3'260	3'250	2
МОЛОКО 3,2% ПАСТ.1Л П/П МИ	1.000	2'070	2'070	2
СОСИСКИ АВГУСТОВСКИЕ ЛЮКС	0.780	16'010	12'490	12
ПАКЕТ П/Э ФАСОВОЧНЫЙ	1.000	120	120	2
ХЛЕБ НАРОЧАНСКИЙ ЗАВАРНОЙ	0.250	4'680	1'170	2
ПАКЕТ П/Э ФАСОВОЧНЫЙ	1.000	120	120	2
СВИНИНА 2КАТ В/К МОРОЖ.100	0.938	14'330	13'440	14
ПАКЕТ П/Э ФАСОВОЧНЫЙ	1.000	120	120	2
ВОДА МИНСКАЯ-4 ЛЕГКАЯ С АР	1.000	3'650	3'650	2
СЕЛЬДЬ ФИЛЕ КУСОЧКИ В ЛИМО	1.000	4'220	4'220	11
СВИНИНА ШЕЙНАЯ ЧАСТЬ	0.966	24'940	24'090	14
ПАКЕТ П/Э ФАСОВОЧНЫЙ	1.000	120	120	2
СВИНИНА П/Ф ДЛЯ ОТБИВНЫХ К	0.752	25'260	19'000	14
ПАКЕТ П/Э ФАСОВОЧНЫЙ	1.000	120	120	2

СУММА ПО ЧЕКУ : 85'830 РУБ
СКИДКА С ЧЕКА : 110 РУБ
ИТОГО : 85'720 РУБ
ПОЛУЧЕНО НАЛИЧНЫМИ : 85'720 РУБ
Фискальный документ No: 00189465
Заводской No : 00000059С0825250
Регистр. N ККМ : 00000059С0825250
УНН : 100508337
000000085720+Ф_РБ 12-07-11 11:13
Карта №
Владелец

СПАСИБО ЗА ПОКУПКУ! МЫ ОТКРЫТЫ ЕЖЕДНЕВНО С 8 ДО 23!
"Торговый центр "У КУРГАНА" ООО

А ведь мы, живя весьма стесненно в средствах, далеко не каждый раз имеем возможность оставить в магазине 85 тысяч. Наш тощий семейный кошелек (муж — единственный кормилец) такого не позволяет: забот и потребностей каждый день — голова кругом!

Хотелось бы все наши "скидки", которые и заметить-то невозможно, с превеликой "благодарностью" вернуть автору гениальной придумки, спроектированной по типу "дешево и сердито": расхода державе — почти никакого, зато шуму про заботу о многодетных — на весь мир!

К чему это лицемерие, неумная игра? Неужели кто-то думает, что мы ее не видим и не понимаем? Понимаем и видим: так жить — в нищете и в болоте обмана дальше невозможно! Всей душой поддерживаю молодежь, которая выражает молчаливый протест против того, что делается в стране, где издевательство над человеком стало нормой. И если пока мы сами не выходим на улицы, то потому, что нечем будет штраф платить, если схватят.

Спасибо и низкий поклон тем, кто не боится, кого не останавливают ни дубинки, ни суды, ни тюрьмы. Всей душой с ними. Дай Бог им всем здоровья и силы духа вынести все испытания, которые власть обрушила на них только за то, что они умны и благородны, любят свою страну и желают свободы и добра не только для себя.

С уважением —

многодетная семья ПРОСИНКО.
Минск.

З НАТУРЫ

«Мадэлька»

Мы даўно не бачыліся. І, сустрэўшы выпадкова, я не адразу яе пазнаў. Помню Галіну Іванаўну жыццярадаснай, мажной, з пышнымі формамі кабетай, а тут... Перада мной стаяла худзенечкая жанчына, у якой ад былога засталіся хіба што жывыя, усмешлівыя вочы.

Я крыху сумеўся і, каб не выдаваць сваю няёмкасць, не завохкаць-запрычытаць з-за яе амаль не пазнавальнага выгляду, пэўна, не вельмі ўдала пажартаваў:

— Галіна Іванаўна, вы гэта ці не вы? Ну проста мадэлька якая, хоць на подыум!

Ляпнуў — і спалохаўся, што жанчына пакрыўдзіцца. А яна — вось жа характар! — падхапіла жарт і трапіла мне ў тон:

— Мадэлька, кажаце? Куды ім да мяне, тым мадэлькам! Шкадую іх: пакутніцы, розныя трэнінгі ў іх жылы цягнуць, усялякія дыеты па гадзінах і хвілінах, вечнае трыманне перад сабой даўжэзнага спісу, што можна, а чаго нельга. З глузду можна з'ехаць, не жыццё, а мучэнне!

— А вы, падобна, знайшлі свой спосаб набыць маладую зграбнасць?

— Ой, даражэнькі, знайшла, толькі не адразу. Спачатку таксама мора ўсемагчымых дыет пераспрабавала, столькі грошай распусціла, ды без толку. Раззлавалася на сябе — і апетыт знік. Расходы на ежу сталі меншыя... А калі пачало ўсё больш і больш прыпякаць — пенсіі не стала хапаць на самае-самае, выйсце знайшлося само сабою.

— Якое ж, калі не сакрэт?

— Нікому не скажаце? — яна па-змоўніцку панізіла голас. — Тады слухайце, сама дадумалася. Стала галадаць "дзеля фігуры" не па модным дыетычным графіку — галаданне цягам некалькіх дзён, а па сваім, больш рацыянальным: ем зараз толькі праз дзень. Уяўляеце, як здорава? Пенсію ж бяру поўнасцю за месяц, а харчуюся толькі палавіну. Вось і эканомія, і "мадэльнасць"! Адразу жыццё палепшала, за кватэру плаціць не спазняюся. Ну, а тое, што дыхаць і хадзіць усё цяжэй і на лекі ўсё роўна не хапае, — дык гэта дробязі, ці не так, даражэнькі?

Мы яшчэ пагаманілі ў тым жа духу, і я па-іншаму ўжо, са шчырай сімпатыяй глядзеў на старую, знясіленую жанчыну, якая і ў бядзе не губляе пачуцця гумару, асвятляе іншых сваёй усмешкай. Дай Божа ёй здароўя і сілы духу на ўсе гады, што адмераны лёсам.

Алесь ВІЛЕЙСКІ.

SOS!

Дапаможам!

Беларускае рэспубліканскае таварыства «Дзеці ў бядзе» звяртаецца па дапамогу.

Таварыству, якое аб'ядноўвае 150 сем'яў, што выхоўваюць дзяцей-інвалідаў (пакутуюць на анкалагічныя і гематалагічныя захворванні), не хапае сродкаў на аплату транспартных выдаткаў. Дзяцей збіраюцца звазіць на рэабілітацыю і аздараўленне на мора ў Балгарыю. Не хапае трох мільёнаў беларускіх рублёў.

Пералічыць грошы можна на банкаўскі рахунак.

Брэсцкае аддзяленне ГА "БРТ "Дзеці ў бядзе", г. Брэст, вул. Маскоўская, 275. Тэл.: 46-66-56, 43-04-44. Р/рахунак 3015120914015 Рэгіянальная дырэкцыя №100 ААТ "БПБ-Банк", код 153001369, УНП 200257659.

ДАРЭЧЫ

Нявыгадныя рагулі

Нядаўна прачытаў у "Народнай Волі", што літровая бутэлька мінеральнай вады каштуе ў нас удвая больш за літр малака, якое калгасы прадаюць дзяржаве. Захацеў даведацца, а як канкрэтна ў нашым раёне? Навёў даведкі ў аддзеле па закупцы і якасці сельгаспрадукцыі райвыканкама. Лічбы проста ўразілі: аказалася, цана літра слуцкага малака найвышэйшага гатунку "экстра" цягне на 1331 рубель. Столькі плаціць за яго дзяржава працаўнікам некалькіх перадавых гаспадарак — "Лучнікі", "Казловічы", "Вясейскі Пакроў", "Ісерна". А ўжо за літр малака проста вышэйшага гатунку ідзе 1149 рублёў, першага — 1061 рубель.

Здатчыку ж малака ад уласных кароў, незалежна ад якасці прадукцыі, цана стандартная, хоць трымай звышпародзістую рагулю, зусім смешная — 965 рублёў за літр! А па праўдзе, дык крыўдная. На гэтыя грошы можна купіць у магазіне ці аўталаўцы палову бохана жытняга хлеба.

Так што зацікаўленасці ў продажы малака, як бачым, у вяскоўцаў ніякай. Ці не таму на падворках у нашым раёне зараз усяго 1423 каровы — на 320 менш, чым было два гады таму. На 220 вёсак гэта няшмат, бо ўжо не ў адным дзясятку з іх, дзе засталіся пажылыя людзі, кароў ніхто не трымае. Пенсіянеру цяжка назапашваць сена, бракуе і адсутнасць выпасаў паблізу. Цяжка і нявыгадна шчыраваць з апошніх сіл амаль задарма па сённяшніх цэнах...

Міхаіл ТЫЧЫНА.
г.Слуцк.

БЫЛО...

А храм тады адстаялі!

Нядаўна прыхаджане капыльскай вёскі Васільчыцы адзначылі 110-годдзе сваёй Свята-Успенскай царквы. З гэтай нагоды прайшло ўрачыстае набажэнства, якое вёў вікарый Мінскай епархіі епіскап Барысаўскі Веніямін. Ён перадаў храму ікону "Троіца".

У 30-я гады мінулага веку, як і па ўсёй Беларусі, мясцовыя сельсавецкія атэісты зачынілі царкву і прыстасавалі будынак пад клуб. Падчас вайны вяскоўцы зноў збіраліся тут на набажэнствы. У 1960-м раённыя ўлады асудзілі царкву на знос. Аднак — асечка! Жыхары вёскі, узяўшыся за рукі, засланілі сабой будынак і заявілі: "Не дамо! Пабойцеся Бога!". І царква ацалела. Рэдкі, вельмі рэдкі выпадак.

У канцы 90-х гадоў намаганнямі сельсавета, мясцовага калгаса і неабыякавага прадпрымальніка храм адрамантавалі, а ў 2004-м асвяцілі для набажэнстваў.

Падобная акцыя супраціву вернікаў ваяўнічым атэістам мела месца і ў 1961 годзе ў стаўбцоўскай вёсцы Мікалаеўшчына, дзе раённыя ўлады рашылі знесці драўляны будынак царквы, у якой, па ўспамінах старажыхароў, бацькі Якуба Коласа хрысцілі маленькага Кастуся Міцкевіча. Дзясяткі тутэйшых жанчын сабраліся вакол храма, перагарадзіўшы дарогу разбуральнікам.

Са Стоўбцаў прыехала міліцыя са зброяй. На загад разысціся вяскоўцы працягвалі стаяць моўчкі. Пачуўся загад старшага па званні міліцыянта:

— Не разойдетесь — откроем огонь на поражение!

Толькі пасля гэтага заплаканыя жанчыны разышліся, шкадуючы, што іх зямляк Якуб Колас не дажыў да гэтага дня, а то дапамог бы ім бараніць храм як дэпутат Вярхоўнага Савета БССР...

У канцы 90-х гадоў па патрабаванні жыхароў вёскі тут прыстасавалі пад праваслаўны храм памяшканне былой крамы. Мне давялося слухаць на богаслужэнні песнапенні цудоўнага жаночага хору...

У далёкія ж 30-я, баючыся рэпрэсій НКВД, не часта прыхаджане адважваліся бараніць ад згубы свае храмы. Так было ў Слуцку, куды з Мінска прыехалі сапёры са спецбатальёна, каб узарваць на Замкавай гары, у самым цэнтры горада, пабудаваны яшчэ ў XIX стагоддзі Свята-Мікалаеўскі сабор. Чырвонаармейцы ачапілі тэрыторыю вакол, нікога не падпускалі. Узарвалі сабор толавымі шашкамі, а на падмурку перад самай вайной пачалі ўзводзіць Дом культуры, будаўніцтва якога закончылі толькі ў 1950 годзе.

Так цэнтр Слуцка і застаецца, калі не лічыць драўлянай капліцы Святой Варвары паблізу ракі, без вартага слаўнай гісторыі горада праваслаўнага сабора, хоць месца пад яго знайшлося б паблізу Замкавай гары.

Міхаіл ТЫЧЫНА.
г.Слуцк.

Дошка гонару

Вязням прысвячаецца...

Дзень добры, шаноўная "Народная Воля"!

Звяртаецца да вас са Смаргоні Юрый Кутузаў. Па-першае, хачу павіншаваць вас з перамогай у змаганні за сваё існаванне і пажадаць доўгіх гадоў жыцця і поспехаў у вашай высакароднай справе.

Па-другое, я вельмі абураны рашэннем судоў па разглядзе касацыйных скаргаў асуджаных удзельнікаў Плошчы-2010. Час адкажа і тым, хто выносіў тыя выракі, і тым, хто іх падтрымаў, ну і, зразумела, галоўным замоўцам. Я ж у сваю чаргу хачу прапанаваць на старонку вашага (і нашага) выдання свой верш, прысвечаны ўсім тым, хто пацярпеў ад дзеянняў гэтай нахабнай улады — усім палітзняволеным. Спадзяюся, што гэтыя радкі дойдуць да іх і хоць нейкім чынам на нейкі час будуць для іх маральнай падтрымкай.

Асуджаным за Плошчу-2010

"Птушкам з выраю,
Птушкам з выраю
Кожнай вясной
Вяртацца да сваіх дуброў..."

У. Някляеў

Хутка вернуцца птушкі з выраю
Да сваіх лясоў, да сваіх дуброў,
Каб адказ даць ганебным выракам,
Ды вярнуць сьвятло на зямлю ізноў.

І засьвеціць знава ў небе сонейка.
І дыхнецца пад ім усім з палёгкаю,
Бо свабодай — вятры напоўняцца,
Вольны дух панясуць аблокамі.

І не вернуцца больш цемрашальства і страх.
Промні праўды праб'юць змрок і хмары ілжы.
Залунае ў нябёсах гістарычны наш сьцяг.
Шлях наперад падкажуць нашых продкаў крыжы.Жыве Беларусь!

Народная Воля
http://www.nv-online.info
2 ЖНІЎНЯ 2011 г.

КОРОТКО

Обама потрясен жестокостью сирийских властей

Президент США Барака Обама выступил с резкой критикой действий сирийских властей, жестоко подавивших акции протеста в городе Хама, в результате чего погибло около 140 демонстрантов. Обама сказал, что его потрясла жестокость, с которой правительственные войска действовали против своего народа, и пообещал сделать все, чтобы изолировать президента Сирии Башара Асада.

По свидетельствам очевидцев

Акцёра Купалаўскага тэатра Мікалая Кірычэнку заўсёды параўноўвалі з мега-зоркамі Еўропы: з французскім комікам Фернандэлем, з італьянцам Чэлентана, а цяпер, з узростам, амаль з вялікім Жанам Габенам. І параўнанні ніколі не здаваліся нацяжкай. Нетутэйшы каларыт у твары, цудоўная пластыка, разумны смутак у вачах... Здавалася б, з такой фактурай, якую Кірычэнку падаравала прырода, ён павінен 25 гадзін у суткі вылучаць аптымізм. З такім акцёрскім паслужным спісам, які нікому не скінуць з рахунку (каля 100 роляў на сцэне, а яшчэ кінафільмы, дабротныя серыялы), жыць можна, адным плячом расхінаючы праблемы. Аднак не... Чалавек-Кірычэнка перажывае, акцёр-Кірычэнка перажывае: знікла пачуццё руху ў творчасці. Паўза зацягваецца. Ідзе двайны юбілейны год — 65-годдзе з дня нараджэння і 40-годдзе службы ў Купалаўскім тэатры — а новых роляў няма. Няма рэпетыцый у акцёра! Акцёра, які адзначаны афіцыйнымі рэгаліямі, які прызнаны публікай. І як жыць? Аб сэнсе жыцця ў адсутнасці новых роляў і старой намоленай сцэны (рэканструкцыя Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў самым разгары) і атрымалася гаворка з Мікалаем Міхайлавічам.



1. – Якімі прыметнікамі вы ахарактарызавалі б сябе самі?

— Магчыма, я вялікі зануда!

— Гэта назоўнік!

— Тады — занудлівы. Я паўтараю і часта перапытваю, каб данесці сказанае да субяседніка.

2. – Магчыма, гэта якасць сфарміравалася ад шматгадовых адносін з вучнямі ў Акадэміі мастацтваў, дзе выкладаеце акцёрскае майстэрства?

— Вучань — слова адказнае, паняцце аб'ёмнае. Гэта не той, хто прысутнічае на тваіх занятках. Вучань — гэта школа. Прынцыпы тэатра, якімі кіруюся я, завешчаны мне настаўнікам Дзмітрыем Аляксеевічам Арловым — я перадаю ў спадчыну тое, што прывіў, уклаў у мяне вялікі майстра, вялікі акцёр. Гэта моцныя эпітэты, і мне самому не па сабе, таму што не ўсё магчыма нават перавесці ў словы — па крайняй меры такое значэнне мае асабіста для мяне мой педагог.

3. – І як студэнты асвойваюць зараз прынцыпы рускага псіхалагічнага тэатра?

— Цяжка. Таму на занятках я часта пытаюся: "Я зразумела сказаў?". Не для звязкі слоў, раней у мяне гэтай фразы не было. А цяпер, на жаль, у сувязі з многімі абставінамі ў мяне няма ўпэўненасці, што мяне разумеюць. Маладыя — другі грамадскі зрэз. Калісьці я здзіўляўся, што няўжо надыдзе час, калі буду казаць: "Вось калі мы вучыліся... Мы ж такімі не былі!"? Гэты час настаў... Аднак я зразумеў і іншае: маладыя не могуць быць такімі, якімі калісьці былі мы. І зразумела, яны дзеці іншай атмасферы, яны жывуць у свеце інтэрнэта, на гэтым выхоўваюцца, фарміруюцца.

Адбракоўваць з-за гэтага студэнтаў нельга. Але спосаб мыслення ў іх ужо змяніўся! Кліпавасць, "рваность"... А тут яшчэ тэлебачанне дэманструе серыялы-самапалкі. Чуеш некаторыя дыялогі і вушам сваім не верыш. Які тут Станіслаўскі з другімі планамі, падтэкстамі, партнёрствам, канфліктам... Тэкст, проста тэкст без аб'ёму. А нехта прымае гэта за ідэал.

4. – Акцёр можа сам аб'ектыўна ацаніць сваю ігру?

— Бадай што не заўсёды. Гэта ўсё-такі іншая прафесія — кіна- і тэатральная крытыка. Хоць калі табе здаецца, што ты ну так ужо даў на сцэне, так даў!.. Купаешся ў пачуццях, эмоцыі пырскаюць, слёзы... А потым партнёры ў цябе пытаюцца з прыкрасцю: "Куды цябе сёння несла?"

5. – А добрая роля ўплывае на асабістае жыццё? Тое, што акцёр сёння іграе на сцэне, перадаецца яго характару?

— Гэта ўжо занадта... Калі б кожная роля ўплывала, уяўляеш, якімі монстрамі мы былі б дома!

6. – Чалавек жыве будучым, але заўсёды ацэньвае мінулае. Які перыяд творчасці здаецца самым плённым? Хаця лепшае, канечне, наперадзе...

— Мне цяжка зараз паверыць у лепшае будучае, у мяне такое адчуванне, што якраз усё ззаду. Плённая творчасць прыйшлася на маё саракагоддзе і два наступных дзесяцігоддзі. Я іграў у многіх добрых спектаклях "Князь Вітаўт", "Чорная панна Нясвіжа", "Чычыкаў"... Мяне пачалі актыўна запрашаць у кіно: "У жніўні 44-га", "Анастасія Слуцкая", "Шчыт Айчыны". Я здымаўся ў добрых расійскіх серыялах. Пацвердзілася папярэджанне настаўніка, што мой час наступіць у сталым узросце. Уласна кажучы, я і ў інстытуце іграў узроставыя ролі, у 20 гадоў — старых. Настаўнік казаў, што маладога героя з мяне не атрымаецца. І доўга з маёй знешнасцю ў Нацыянальным тэатры не было роляў, у тэатры я перажыў перыяд прастою. Я ведаю, што такое адчай і дамоклаў меч асабістых падазрэнняў: ці патрэбны я трупе?

7. – Не шкадуеце, што патрацілі чатыры гады акцёрскага жыцця на работу дырэктарам тэатра, выкупаліся, так бы мовіць, у бурнай (а часам і бруднай) вадзе адміністрацыйнага патоку?

— Я цяпер адкручваю час... Меркаванні могуць быць розныя. Кар'ерызм, азарт улады? Не. Для мяне гэтая прапанова была шокавай. Якія б домыслы па гэтай прычыне ні хадзілі. Мне паведамілі: так і так, прынята рашэнне... У той момант на мяне рухнуў небаскроб.

— На перыяд вашага дырэктарства прыйшоўся вядомы канфлікт у Купалаўскім тэатры: пісьмо акцёраў у Адміністрацыю прэзідэнта, паходы туды са скаргамі.

— Так, я як дырэктар, лічу, быў саўдзельнікам гэтай "сваркі", не стаяў збоку. Складаная сітуацыя. Але сёння ўспамінаецца ўжо не так востра.

8. – А што, атмасфера ў тэатры з прыходам новага рэжысёра кардынальна змянілася ў лепшы бок?

— Я не магу аналізаваць сённяшнюю атмасферу, мы існуём зараз па-за роднымі сценамі з-за рэканструкцыі і рамонту. Прыходзіць новы рэжысёр, ён нешта мяняе — гэта яго права. Правільна ці не — не мне судзіць. Хаця ў мяне можа быць сваё суб'ектыўнае меркаванне. І яно існуе. Але паўтараю сваю любімую фразу — ускрыццё пакажа. Вось праект рэканструкцыі тэатра — ён нараджаўся яшчэ пры маім дырэктарстве. І быў іншым. Я не вітаю змянення фасада тэатра, я лічу гэта цацачным. "Давайце зробім, як было раней". Дык давайце вяртаць і ўсё астатняе! А так часткова. Вось і атрымліваецца з будынка кентаўр: крыж ("каня") застаецца савецкім, а "морда твару" іншая, 1890-х гадоў. Я з гэтым не згодны. Вакол будынка тэатра даўно склаўся ансамбль квартала, фасад тэатра ў яго быў арганічна ўпісаны. І наогул наш Купалаўскі тэатр менавіта з такім, савецкім, фасадам стаў вядомы ў краіне ўсім гледачам. Навошта мяняць? І заўсёды казаў гэта на нарадах. Не ў гэтым сэнс адраджэння. Чаму б не вярнуць тады гістарычны воблік Кастрычніцкай (былой Цэнтральнай) плошчы, на якой яшчэ пасля вайны стаяў велічны сабор?

9. – Чаму дырэктарства скончылася так нечакана? Гэта звязана з асаблівым меркаваннем наконт рэканструкцыі?

— Скрытых канфліктаў хапала... Але галоўнае — узнікла тая сітуацыя, аб якой я сумленна папярэджваў вышэйстаячыя органы ў першыя дні знаходжання на пасадзе дырэктара. Я сказаў, што калі наступіць момант, што мне трэба будзе выбіраць паміж адміністрацыйным крэслам і сцэнай, то я не пайду са сцэны ніколі. І такі момант настаў. Дакладна, мяне да гэтага падвялі: "Вызначце! Вы дырэктар? І будзьце дырэктарам! Чаго вы цягаецеся (менавіта такім словам) на сцэну?"

10. – А сапраўды, акцёр не перашкаджаў дырэктару? З-за пачуцця таварыства, мабыць, не змаглі правіць да калег патрабавальнасці, адміністрацыйнай цвёрдасці? Ці не так?

— Не так. Але я зразумеў, што настаў час канчаць. Я напісаў заяву аб звальненні, не ўзгадняючы ні з кім. Вось гэта сапраўды было нечакана. Заяву прыйшлося пісаць тры разы — яе не прымалі ў справаводства. Гэта ніякае не геройства, проста не часта чалавек сам пакідае пасаду генеральнага дырэктара ўстановы. І я думаю, гэта было зроблена своечасова.

11. – Цікава, а былы калега, артыст Генадзь Давыдзька, цяперашні старшыня Белдзяржтэлерадыё, прыходзіць у тэатр? Наведвае родныя пенаты?

— Раней прыходзіў. Як ганаровы госць. Туга па сцэне яго прыводзіла да нас ці візіты ветлівасці, мне цяжка сказаць. Аднак зараз, відаць, няма калі. Ведаю, ён займаецца рэжысурай на тэлебачанні.

— Ну, гэта мы ўсе ведаем. Фільм "Плошча. Железом по стеклу" ўвойдзе ў першы радок яго творчай біяграфіі.

— Гэта яго права, яго пазіцыя. Некалі мне прапанавалі агучыць адзін ролік. Я паспрабаваў адмовіцца (прызнацца, я нічога ніколі не агучваю, гэта проста розныя прафесіі), ды і тэма роліка мне катэгарычна не падабалася. Аднак мне сказалі: "Разумееце, акцёр Кірычэнка можа адмовіцца. А генеральны дырэктар не можа". Але хопіць ужо пра палітыку.

12. – Аднак яна ўплывае на творчае жыццё?

— Надвор'е ўплывае на наша жыццё, а палітыка... Заганяецца ў падсвядомасць, а потым усё роўна выстрэльвае.

13. – Цікава, на чыім баку сімпатыі ў канфлікце бакоў у тэатры на Таганцы? Вы ж пабывалі на двух берагах, дырэктарам тэатра і акцёрам — хто там мае рацыю?

— Знаходзячыся ў горадзе Мінску, немагчыма вызначыць невінаватасць аднаго ці іншага чалавека. У нас, як ўзгадвалася, таксама было пісьмо наверх, таксама гаварылі пра канфлікт у тэатры імя Янкі Купалы. Але заўсёды ёсць вонкавы бок канфлікту і ёсць глыбока ўнутраны, які не агучваецца, але трымаецца ў думках. Я не маю права даваць ацэнку. Канечне, тая размова, якую я чуў па тэлебачанні ў запісе, размова рэжысёра з акцёрамі, пакідае непрыемнае ўражанне. Нельга дыктатарскі кіраваць акцёрамі...

14. – А акцёры — "сукіны дзеці"?

— Канечне! Але — дзеці! На гэтым будуецца тэатр. Мяне сапраўды іншы раз папракаюць, што я неўраўнаважаны. А ці добра для акцёра быць спакойным? Да мяне на завочнае аддзяленне (ёсць такая форма навучання для акцёраў з перыферыі, таму што ў іх часта няма спецыяльнай вышэйшай адукацыі, а толькі студыйная), — дык вось да мяне на курс прыходзіць дзяўчына, я яе праслухоўваю. І потым у размове яна мне прызнаецца, што калі сказала сваім, што ідзе на курс да Кірычэнкі, яны ўсклікнулі: "Ты што, з глузду з'ехала? Ён жа б'е студэнтаў!"

— А што — было?..

— Так, прыйшлося трасянуць аднаго хлопца — ён тануў, гінуў ад дэпрэсіі. Я заўсёды кажу студэнтам: "Я ніколі на вас не крычу. Памятайце. Я эмацыянальна перадаю свае думкі. Я не магу крычаць на вас, каб пакрыўдзіць. Я крычу, каб падштурхнуць вас да наступнай прыступкі, прабіцца да вас". З халодным носам нельга выкладаць. Толькі праз тэкст, літаратуру не навучыш — праз эмоцыі дабіваешся добрых вынікаў. Зараз са студэнтамі ўсё складаней і складаней, таму што яны становяцца ўсё больш рацыянальнымі, да іх цяжка прабіцца, расшавяліць. А гэта і немагчыма без уласнага энергетычнага заводу. Аднойчы я ў запальчывасці ў час заняткаў сарваў гадзіннік і палажыў яго на стол. Студэнты раптам, бачу, насцярожыліся. "Што такое?" — пытаюся. Яны адказваюць: "Мы вырашылі, вы зараз пачняце нас граміць..." А я гадзіннік сарваў ад напружання — звычка! Столькі ўжо бранзалетаў паламаў...

— Ну, выдатны дырыжор Тасканіні на рэпетыцыях кідаў гадзіннік аб падлогу і таптаў нагамі.

15. – Гады, вопыт прыбавілі чалавекалюбства? Ці наадварот?

— Наадварот... Напэўна, бываюць перыяды расчаравання... І, падобна, зараз у мяне менавіта такі перыяд. Было пытанне аб прыметніках у мой адрас. Дык вось я раніма-сентыментальны. Я магу пакутаваць цэлы дзень, калі мяне не заўважыў у калідоры калега. Ён проста хутка прабег, а я падкладваю пад гэта складаныя адносіны...

16. – Якія падзеі робяць шчаслівым?

— Я адчуваю сябе шчаслівым, калі ў маім тэатры адбываюцца падзеі, якія прымушаюць гаварыць аб ім грамадства. 40 год у тэатры — міжволі перажываеш за ўсіх і ўсё.

17. – Цяжар пазнавання, славы — няўжо гэта не прыемна?

— Прыемна! Я не хачу сябе падманваць. Акцёр не можа не быць амбіцыёзным. Акцёр выходзіць на сцэну, каб атрымаць адваротную рэакцыю залы. І калі незнаёмыя вітаюцца на вуліцы, калі просяць падпісаць праграмку ў метро — так, гэтыя імгненні сагараюць.

18. – Вядома такое пачуццё як адзінота?

— Яшчэ як. Асабліва апошнія гады. Калі аднойчы быў кіраўніком, а потым пакідаеш крэсла, вакол цябе запаноўвае вакуум. Аднак у мяне ёсць добрыя сябры.

19. – Міф аб мужчынскай дружбе не перабольшванне?

— Не!

20. – Ёсць уменне адпачываць?

— Не. Не ўмею пераключацца. Гэта мая бяда. У мяне аднойчы ўзніклі сардэчныя праблемы, на мяне на суткі павесілі датчыкі-прыборчыкі. Потым у доктара былі вялізныя вочы: "Як вы жывяце? У вас жа сэрца не адпачывае! У вас 80 ударав пульс нават ноччу". Я не ўмею адпачываць... Калі ў мяне ёсць праблема, яна будзе жэрці мяне і днём, і ноччу. Я магу нічога не рабіць, нават не варушыцца, аднак у галаве атамны рэактар.

21. – Неабходны нейкія асаблівыя ўмовы, калі ідзе праца над новай роллю?

— Калі я быў дырэктарам, "зверху" аднойчы патрабавалі зрабіць улік працоўнага часу акцёраў. Прыход-сыход, і каб яны ў журнале распісваліся. Вы лічыце, гэта прыдатна да акцёрскай прафесіі, спытаўся я? Як можна вылічыць час, калі акцёр працуе, а калі не, нават калі ноччу ён можа ўскочыць і зразумець, што зрабіў у ролі, у вобразе? Падчас у метро, трамваі на цябе глядзяць, як на вар'ята, таму што, рыхтуючыся да рэпетыцыі, ты не проста чытаеш, вучыш тэкст пра сябе, а прайграеш яго. Ты забываеш, што вакол людзі, і ўсё адбіваецца на тваім твары, як у "городского сумасшедшего", які нешта вечна бармоча сабе пад нос. Унутраная работа ідзе пастаянна і "асаблівыя ўмовы" акцёру не патрэбны.

22. – Ёсць у чалавека права на памылковы погляд?

— Ёсць.

— Нават у вялікага кіраўніка?

— Ёсць. Таму што ёсць кіраўнікі, а ёсць чыноўнікі (хаця фармальна яны ўсе чыноўнікі, аднак і не ўсе акцёры — акцёры, ёсць рамеснікі). Дык вось чыноўнікі не маюць права памыляцца, яны выканаўцы, рамеснікі. А кіраўнік — стратэг. Але не Гасподзь Бог. І павінен умець прызнаваць свае памылкі. Тады яму даецца картбланш.

23. – Вы, Мікалай Міхайлавіч, можаце прызнаць чужы пункт погляду і сваю вінаватасць?

— Так, у апошні час, мне здаецца, я навучыўся не быць катэгарычным. І мне хапае мужнасці прызнаць, што я памыляюся.

24. – Ёсць месца на зямлі, дзе асабліва хораша?

— Ужо няма. Калі прыйшоў час і разумееш, што твой час набліжаецца да канца, то цяжка знайсці месца, дзе душа была б у раўнавазе. Так, усё зразумела, і правільна: час збіраць камяні. Але змірыцца з гэтым цяжка, не хочацца... Калі ты рабіў 12, нават 18 спектакляў у месяц, а засталося два-тры... Пачуццё такое, быццам цябе выштурхнулі з сядла. Усё аб'ектыўна і зразумела. Аднак гэта не супакойвае...

25. – Якія якасці характару хацелася б знайсці ў сваіх дачок?

— Абавязковасць. Асабіста я вельмі абавязковы чалавек. Сказаўшы "так", не магу абяцанага не зрабіць. Здаецца, гэта мяжуе з рабствам — я да апошняга залежу ад уласнага слова. Але як інакш жыць?

Алена МАЛОЧКА.

ДАСЬЕ «НАРОДНАЙ ВОЛІ»

Народны артыст Мікалай Кірычэнка нарадзіўся ў Маладзечне. Закончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (курс Дзмітрыя Арлова). З 1971 года служыць у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. З 2005-га па 2009 год працаваў генеральным дырэктарам тэатра.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, прэміі імя Ігнація Буйніцкага, кавалер ордэна Ламаносава. Лаўрэат Спецыяльнай прэміі прэзідэнта.

Выкладае ў Акадэміі мастацтваў, дацэнт кафедры майстэрства акцёра. Жанаты, двое дзяцей. Жыве ў Мінску.

За свадьбой — в Беларусь!

В нынешнем году через столичный Дом бракосочетаний прошли граждане более чем из шести десятков государств.

По словам заведующей Дома бракосочетаний Надежды Реутской, за первые шесть месяцев 2011-го были зарегистрированы браки минчан и минчанок с иностранцами из 65 государств. В прошлом году свое счастье в Беларуси нашли граждане 47 стран.

Больше всего новобрачных приезжает из России. В семерку самых популярных стран вошли также граждане Италии, Турции, Германии, США, Великобритании и Израиля.

Несмотря на то, что расписаться с иностранцем можно в любом столичном загсе, Дом бракосочетаний пользуется наибольшей популярностью. Как сообщает агентство "Минск-Новости", с января по июнь 2011 года здесь зарегистрировано 168 интернациональных браков.

Гомельская пракуратура выкрыла фальш міліцыі

Канстанцін Балуеў, раней асуджаны за збыт наркотыкаў па крымінальнай справе, сфальсіфікаванай міліцыянтамі, цалкам апраўданы.

Рашэнне прызнаць маладога чалавека невінаватым і цалкам апраўдаць прыняў 25 ліпеня суддзя суда Чыгуначнага раёна Гомеля Алег Шапіра. Абвінавачаны быў вызвалены ў зале суда, паведамляе БелаПАН.

Тое, што справа была фальшывай з боку міліцыі, устанавіла пракуратура. У маі 2011 года прэзідыум абласнога суда прысуд у дачыненні да Балуева адмяніў, а справу накіраваў на новае судовае разбіральніцтва.

БУДЬТЕ ГОТОВЫ!

Жара заставляет белорусских змей заползать в огороды

В жаркую погоду в поисках благоприятного климата змеи, в частности гадюки, могут заползать на влажные после полива огороды на дачных участках и в деревнях. Но при условии, что их типичное место обитания находится поблизости — на расстоянии не более 200 метров.

Об этом в беседе с корреспондентом агентства "Минск-Новости" рассказал ведущий научный сотрудник ГНПО "НПЦ НАН Беларуси по биоресурсам" кандидат биологических наук герпетолог **Сергей ДРОБЕНКОВ**.

Если гадюка заползла на огород или в помещение, желательно обратиться к специалистам. В частности, получить консультацию герпетолога Сергея Михайловича Дробенкова можно по тел. **284-21-92**. Он посоветует, как действовать в конкретной ситуации. Если же наблюдается массовое нашествие змей, специалисты выезжают на место и разбираются в проблеме.

В крайнем случае можно попытаться, соблюдая предельную осторожность, самому поймать змею с помощью длинной палки, забросить в какую-нибудь емкость, например большое ведро, отнести подальше в лес и выпустить. Но убивать ее не стоит.

К типичным местам обитания гадюк относятся сырые березняки, ольшаники, прибрежные участки водоемов, кустарники в руслах рек, пограничные территории между лесом и лугом или болотом. То есть влажные участки. Там комфортно и хватает мышей для пропитания. Также змеи могут обосноваться на окраинах сельхозполей, где помимо грызунов лакомятся ящерицами и птенцами мелких гнездящихся на земле птах.

Вероятность наткнуться на змею в Минске — в лесопарке или возле водохранилища — очень мала. Город — неподходящая среда для обитания и выживания белорусских рептилий, отметил Сергей Дробенков.

СТОЛИЦА

На площади Независимости запретили курить

Минская площадь Независимости с прилегающими к ней территориями объявлена зоной, свободной от курения.

Как сообщает пресс-служба Мингорисполкома, сделано это в соответствии с решением администрации Московского района.

Курить также запрещено в кафе и ресторанах, находящихся на площади. Однако при этом не сообщается, какие меры предусмотрены для нарушителей запрета.

ЗАКУЛІССЕ

Падчас загадкавага візіту ў Ізраіль Мясніковіч перадаў Перэсу спіс ахвяр Халакосту

Падчас чэрвеньскага візіту на святую зямлю прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч перадаў прэзідэнту Ізраіля Шымону Перэсу спіс яўрэяў, знішчаных нацыстамі на малой радзіме ізраільскага лідара ў Валожыне.

Валожынскі спіс

Як адзначае ізраільскае інтэрнэт-выданне ynetnews, у спісе жыхароў Валожына, якія сталі ахвярамі Халакосту падчас нямецкай акупацыі Беларусі, ёсць і 22 прозвішчы сваякоў прэзідэнта Ізраіля па бацькоўскай (Перскія) і матчынай (Мельцэр) лініі.

Цяперашні прэзідэнт і былы прэм'ер-міністр Ізраіля, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру-1994 **Шымон Перэс** нарадзіўся ў 1923 годзе ў вёсцы Вішнева пад Валожынам — "беларускай калысцы сіянізму". Ягоны бацька эмігрыраваў у Палесціну ў 1931 годзе, а сам Шымон ужо ў рангу ізраільскага палітыка двойчы наведваў Беларусь — у 1992-м і 1998 годзе. Кажуць, у Вішневе, у двары, дзе калісьці стаяла хата Перскіх, ацалеў іхні калодзеж. На вясковых жа могілках па-ранейшаму знаходзіцца магіла прадзеда прэзідэнта — Шымона Перскага.

Дакумент, які Мясніковіч перадаў Перэсу, таксама апісвае, як нацысты прымусілі сотні яўрэяў Валожына і ваколіцы капаць велізарныя ямы, у якіх іх потым расстралялі, паведамляе tut.by. Параненых хавалі жыўцом. У іншым выпадку апавядаецца пра тое, як акупанты спалілі ў валожынскай сінагозе 400 яўрэяў. Сяродахвяр катаў быў і рабін **Цві Мельцэр** — дзед Шымона Перэса па кудзелі (па матчынай лініі).

"Гэта дзіўна і вельмі кранальна адначасова", — падзяліўся эмоцыямі прэзідэнт Ізраіля, праглядаючы дакумент. Пры гэтым ён адразу пазнаў імёны знаёмых землякоў, некаторыя з якіх былі яго аднакласнікамі. Апроч архіўнага дасье беларускі прэм'ер прэзентаваў ізраільскаму прэзідэнту гліняны гаршчочак з зямлёй з Вішнева і некалькі альбомаў фотаздымкаў з відарысамі часоў Перэсавага дзяцінства.

Загадкавы візіт

Нагадаем, 7—9 чэрвеня Міхаіл Мясніковіч пабываў у Ізраілі з загадкавым візітам, пра які інфармагенцтва БЕЛТА паведаміла толькі на зыходзе другога дня знаходжання беларускага прэм'ера на святой зямлі.

Выданне ynetnews называе візіт прыватным, а беларускія СМІ даведаліся, што Мясніковіч ляцеў з Мінска ў Тэль-Авіў разам з жонкай у эканом-класе.

Відавочна, што візіт не планаваўся загадзя, бо, па-першае, па інфармацыі TUT.BY, супрацоўнікі амбасады Ізраіля ў Мінску даведаліся пра яго з паведамленняў СМІ, а па-другое, паездка беларускага прэм'ера прыпала на адзін з галоўных рэлігійных святаў Ізраіля Шавуот, падчас якога афіцыйныя сустрэчы не ладзяцца.

Ізраільскія СМІ паведамілі, што Мясніковіч правёў сустрэчы з Шымонам Перэсам і міністрам замежных спраў Ізраіля Авігдорам Ліберманам, на якіх сярод іншага абмяркоўваліся "перспектывы ўдзелу ізраільскага боку ў намаганнях кіраўніцтва Беларусі па нармалізацыі эканамічнай сітуацыі ў краіне".

Кастусь ЛАШКЕВІЧ.

КРИМИНАЛ

Белорусская банда грабила церкви в Псковской области

У белорусов изъято около 200 икон.

Сотрудниками оперативно-розыскной части №1 УМВД России по Псковской области совместно с коллегами из санкт-петербургской полиции задержана и изобличена межрегиональная преступная группа, которая занималась кражами антиквариата на территории Псковской и Ленинградской областей.

В состав преступной группы входили жители Республики Беларусь, сообщает пресс-служба УМВД России по Псковской области. В результате проведенных стражами порядка мероприятий установлены места сбыта краденого. Изъято в общей сложности около 200 икон. В настоящее время устанавливается их историко-культурная ценность, а также причиненный злоумышленниками ущерб. Возбуждено уголовное дело.

Иконы похищались преимущественно из церквей, поэтому предстоит еще установить их принадлежность.

Дзяўчына з рэўнасці зарэзала сястру

Трагедыя адбылася ў Столінскім раёне.

У вёсцы Адвержычы дзве сястры не падзялілі каханага. Старэйшай было 27 гадоў, малодшай — 22. Падчас сваркі малодшая ўдарыла сястру нажом. Ад раны старэйшая памерла, паведамляе "Еўрарадыё".

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Залатая Саша

Нарэшце! У калекцыі прыгожай беларускай плыўчыхі Аляксандры Герасімені з'явілася першае золата чэмпіянатаў свету. На першынстве планеты ў Шанхаі Саша выйграла заплыў у самай прэстыжнай дысцыпліне — сто метраў вольным стылем.

І выйграла яго Саша, усталяваўшы нацыянальны рэкорд краіны, праплыўшы дыстанцыю за 53,45 секунды. Абсалютна такі ж вынік паказала дацкая плыўчыха Жанет Отсэн. Так што на вышэйшую ступень п'едэстала сусветнага першынства сяброўкам-саперніцам прыйшлося ўзнімацца разам.

У мінулым годзе ў спартыўнай біяграфіі беларускай спартсменкі таксама былі залаты медаль чэмпіянату Еўропы ў Будапешце на дыстанцыі 50 метраў на спіне, серабро на стаметроўцы вольным стылем на гэтым жа турніры.

Мала хто ведае, што плыўчыхі Сашы Герасімені магло і не быць. Дзяўчыну з самага дзяцінства вабіла мастацкая гімнастыка.

У свой час Саша распавядала карэспандэнту "Народнай Волі":

"У дзяцінстве я была не па ўзросце жвавая. У дзядулі на вёсцы ў Гомельскай вобласці я ў двухгадовым узросце паслізнулася і ўпала ў рэчку. Але гэта ж, канешне, не азначала, што я абавязкова буду займацца плаваннем. Ды і не хацела я, шчыра кажучы, плаваннем займацца. Вось мастацкая гімнастыка — гэта для мяне ў дзяцінстве было ўсё: і прыгажосць, і грацыя. Ружовая мара! Пазаймалася я гімнастыкай крыху, але ўражанняў хапіла на ўсё жыццё. Есці смачнае нельга, пастаянная дыета і, што самае страшнае — моцны кантроль. Туды нельга, сюды нельга, вольны час толькі перад сном і пасля сну. Выбрала плаванне. Праўда, і тут пра вольны час прыходзіцца толькі марыць. Было ў мяне ў свой час вялікае жаданне закінуць купальнік куды падалей, забыцца пра басейн, як пра жудасны сон... Але, я бык па гараскопе, перамагла сябе, працягнула працаваць..."

І сёння, асабліва пасля шанхайскага поспеху, відавочна, што Аляксандра засталася ў плаванні нездарма. Хаця была ў жыцці спартсменкі і дысквалфікацыя, пасля якой можна было б і забыцца на плаванне.

Але Саша па натуры — змагарка. І залаты медаль чэмпіянату свету — узнагарода за напорыстасць.

Ведаю дакладна, што ёсць у жыцці Сашы дзве запаветныя мары — ціхі ўтульны дом у зялёным раёне Мінска, дзе б можна было збіраць разам усіх шматлікіх сяброў, а яшчэ марыць Саша пра алімпійскі медаль Лондана... Дай Бог, каб мары Аляксандры Герасімені здзейсніліся...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Алімпійскі чэмпіён атрымае 150 тысяч долараў

Сталі дакладна вядомы сумы прэміяльных для беларускіх спартсменаў за алімпійскія медалі Лондана-2012.

Алімпійскі чэмпіён атрымае 150 тысяч долараў, сярэбраны прызёр — 100 тысяч, бронзавы — 70 тысяч. На сённяшні дзень Беларусь мае 53 алімпійскія ліцэнзіі ў шасці відах спорту. Па словах міністра спорту і турызму Алега Качана, усяго беларускімі спартсменамі плануецца заваяваць каля 150 алімпійскіх ліцэнзій. Што да медалёвых перспектыў беларускіх атлетаў у Лондане, то тут пакуль усё туманна. Спорт ёсць спорт. Але Міністэрства спорту і турызму Беларусі ўзяло на сябе абавязацельства прывезці з Англіі 25 алімпійскіх медалёў. У тым ліку 5 залатых. Менавіта такую задачу паставіў Аляксандр Лукашэнка.

Шэфам беларускай місіі на Алімпіядзе будзе міністр спорту і турызму Алег Качан.

Адзначым, што спартсмены незалежнай Беларусі выступалі на дзевяці Алімпійскіх гульнях — пяці зімовых і чатырох летніх. Чэмпіёнамі і прызёрамі гульняў сталі 79 беларускіх спартсменаў. Яны заваявалі 75 алімпійскіх медалёў: 11 залатых, 24 сярэбраных і 40 бронзавых.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Алег КАЧАН:

«Калі вам даць салідную суму грошай, то вы зможаце падрыхтаваць не толькі сябе, але і сваіх дзяцей да алімпійскіх вышыняў».

Да Алімпіяды ў Лондане застаецца менш за год. Беларускія атлеты вядуць падрыхтоўку да спаборніцтваў. Алімпійскі чэмпіён па цяжкай атлетыцы Андрэй Арамнаў — адна з галоўных надзей на медаль на XXX Алімпійскіх гульнях у Лондане.

У свой час прэса шмат пісала пра няпростыя адносіны паміж спартсменам і галоўным трэнерам зборнай Беларусі па цяжкай атлетыцы Аляксандрам Ганчаровым.

Тут у кожнага з бакоў свая праўда: Андрэй Арамнаў адмаўляецца трэніравацца пад кіраўніцтвам гэтага спецыяліста, Аляксандр Ганчароў у сваю чаргу кажа, што спартсмена цяжка зразумець...

Ва ўзаемаадносіны трэнера і спартсмена ўмяшаліся чыноўнікі Міністэрства спорту і турызму — Арамнаву дазволілі рыхтавацца да стартаў у Лондане па індывідуальным плане.

*Пра сітуацыю вакол спартсмена журналістам распавёў міністр спорту і турызму **Алег КАЧАН**:*

— На сённяшні дзень Міністэрствам спорту і турызму падпісаны індывідуальны план Андрэя Арамнава аб падрыхтоўцы да Алімпіяды ў Лондане. Ён рыхтуецца да выступленняў пад кіраўніцтвам асабістага трэнера Міхаіла Саладыра. Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальны Алімпійскі камітэт, Федэрацыя цяжкай атлетыкі краіны пайшлі на ўсе ўступкі спартсмену, каб стварыць яму ўсе ўмовы для нармальнай падрыхтоўкі. Вы ведаеце, сёння Андрэй Арамнаў атрымлівае алімпійскую стыпендыю. Гэтыя грошы спартсмен можа выкарыстоўваць на ўласную падрыхтоўку. Гэта сёння салідная сума грошай. Калі вам даць гэтую салідную суму грошай, то вы зможаце падрыхтаваць не толькі сябе, але і сваіх дзяцей да алімпійскіх вышыняў. (Памер алімпійскай стыпендыі зацвярджаецца ўказам Аляксандра Лукашэнкі. Імянныя стыпендыі прызначаюцца ў памерах кратных тарыфнай стаўцы першага разраду. Алімпійскім чэмпіёнам выплачваюць да 200 тарыфных ставак першага разраду. На сённяшні дзень тарыфная стаўка першага разраду складае 118.000 рублёў. Такім чынам, максімальная сума грошай, якая наканавана алімпійскаму чэмпіёну — 23.600.000 рублёў. Праўда, сума стыпендыі вызначаецца для кожнага спартсмена індывідуальна. — **Аўт.**). Гэтыя стыпендыі даюцца прэзідэнтам, каб сям'ю ўтрымліваць і рыхтавацца да выступленняў. Дзяржавай выдзяляецца нямала сродкаў на падрыхтоўку спартсмена Арамнава. Зараз Андрэй Арамнаў знаходзіцца на зборах у "Стайках", дзе рыхтуецца да лістападаўскага чэмпіянату свету, ён — не просты чалавек. Быў бы простым — не стаў бы алімпійскім чэмпіёнам. Складана з ім. Складана... Яшчэ раз паўтаруся, са свайго боку мы стварылі яму ўсе ўмовы. Яму ўжо 21 год, і калі ён чагосьці не разумее, цяжка чалавеку штосьці растлумачыць... Канфлікту з боку галоўнага трэнера Аляксандра Ганчарова з Арамнавым няма. Калі ў яго нешта ёсць да галоўнага трэнера, калі трэнер яго не задавальняе, то калі ласка... Мы табе стварылі ўсе ўмовы. Хочаш "Стайкі" — калі ласка. Працуй. Не падабаюцца "Стайкі", едзь у Барысаў, не падабаецца Барысаў — едзь у Віцебск. Базы сёння ёсць. Трэба табе доктар, масажыст — вось табе і доктар, і масажыст. Вы ведаеце, што ў яго кантракт заключаны з Міністэрствам спорту і турызму. Вы таксама працуеце недзе... Самі ведаеце, як паступае працадаўца. І я такі самы працадаўца для Арамнава. І, канечне, калі будуць нейкія адхіленні ад умоў выканання кантракта, то, канечне, гэты кантракт будзе намі скасаваны. Калі ён чагосьці не разумее. Але на сённяшні дзень ён трэніруецца, вядзе падрыхтоўку да Алімпіяды.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

У ТЭМУ

Віцэ-прэзідэнт НАК Сяргей ЦЯЦЕРЫН: *«Усё вырашыцца ў лістападзе...»*

— Пытанне тут вельмі простае: ва ўсёй каманды па цяжкай атлетыцы ўзаемаразуменне з трэнерам Аляксандрам Ганчаровым ёсць, а ў аднаго чалавека няма. Але праблема гэта хутка вырашыцца: у лістападзе пройдзе чэмпіянат свету па цяжкай атлетыцы. Усё стане на свае месцы. Будзе вынік, можна закрыць вочы на многія рэчы, ну а без выніку — будзе прынята адпаведнае рашэнне...

Міхаіл САЛАДАР: *«У прафесіяналізме Арамнава я не сумняваюся»*

Асабісты трэнер Андрэя Арамнава Міхаіл Саладар распавёў, як зараз рыхтуецца спартсмен:

— Зараз у яго невялікая траўма — нагу на лесвіцы падвярнуў. Днямі Андрэй нармальна трэніраваўся. Канешне ж, плануем паехаць на чэмпіянат свету, і калі траўмы не перашкодзяць, то ён добра выступіць. Але асноўная мэта — Алімпіяда. А так усё ў яго ёсць. Чалавек атрымлівае добры заробак, мае дзве кватэры, а як распараджацца грашыма, кожны вырашае сам. Умовы для трэніровак створаны выдатныя — праблем няма. А канфлікт з галоўным трэнерам — надуманы. Я асабіста ў яго прафесіяналізме не сумняваюся. Усё залежыць толькі ад Андрэя, а мы яму будзем ва ўсім дапамагаць.

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

Лондан рыхтуецца...

Прапануем вашай увазе шэраг цікавых фактаў вакол будучай Алімпіяды

Пад дэвізам эканоміі

Кандыдатура Лондана ў якасці алімпійскай сталіцы Гульняў 2012 года была абрана 6 ліпеня 2005 года.

Спаборніцтвы будуць праходзіць пад дэвізам эканоміі прыродных рэсурсаў. У сувязі з гэтым, мяркуецца, што энергазабеспячэнне галоўнага спартыўнага форуму планеты прыкладна на дзве трэці будзе забяспечваць унікальны ветраны парк, які размясціўся ля паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Вялікабрытаніі.

Акрамя Лондана частка спартыўных спаборніцтваў будзе праходзіць у Глазга, Кардыфе, Манчэстары, Ньюкасле, Бірмінгеме.

Некаторыя з Алімпійскіх аб'ектаў будуць размяшчацца ў Дорні, Портлэндзе, Брпоксбурне.

Цяжкае золата Лондана

Аргкамітэт Алімпійскіх гульняў-2012 прадставіў дызайн медалёў, якія будуць уручацца пераможцам і прызёрам. Дыяметр медаля — 85 міліметраў і 7 міліметраў таўшчынёй. Вага — 400 грамаў. Агулам да Алімпіяды будзе выпушчана каля 2100 медалёў, якія будуць уручаны на 302 цырымоніях узнагароджвання.

На медалях выгравіраваны лагатып Алімпіяды, упрыгожаны промнямі сонца. На зваротным баку — выява ракі Тэмзы і багіні перамогі Нікі. Аўтарам распрацоўкі ўзнагарод стаў дызайнер Дэвід Уоткінс, які якраз спецыялізуецца на працы з металам.

Аднавокія талісманы

Афіцыйнымі талісманамі Алімпіяды-2012 сталі дзве аднавокія істоты — Венлок і Мэндывіль. Гэты выбар арганізатараў быў невыпадковым. Справа ў тым, што ў вёсцы Мач Венлок у пазамінулым стагоддзі праводзіліся спартыўныя спаборніцтвы, якія натхнілі П'ера дэ Кубертэна на стварэнне сучасных Алімпійскіх гульняў. У талісманаў па адным воку, яны носяць веласіпедныя шлемы і на іх намаляваны лагатыпы гульняў. Талісманы былі створаны мастаком Майклам Марпурга.

Новая праграма

Праграма спаборніцтваў Алімпійскіх гульняў у Лондане (у параўнанні з папярэдняй Алімпіядай) змянілася. Бейсбол і софтбол увогуле з яе выключаны. У боксе, упершыню за ўсю гісторыю Алімпіяд, дазволена выступаць жанчынам. Яны будуць спаборнічаць у трох вагавых катэгорыях — да 51, 65 і 75 кілаграм.

У веславанні на байдарках і каноэ па гладкай вадзе мужчынскія спаборніцтвы каноэ-двоек на 500 метраў заменены жаночымі спаборніцтвамі байдарак-адзіночак на 200 метраў.

У тэнісе ўпершыню з 1924 года пройдуць спаборніцтвы сярод змешаных пар.

У парусным спорце спаборніцтвы ў класе торпнада выключаны, а клас інглінг заменены на клас эліот.

У веласпорце будуць упершыню ўведзены омніум у жанчын і мужчын, камандная гонка праследавання, гонка па ачках і мэдзісан.

У гандболе будзе адменены турнір за 5—8 месцы. А ў сучасным пяцібор'і зменіцца фармат спаборніцтваў: бег і стральба будуць аб'яднаны ў адно спаборніцтва.

Усяго на XXX летніх Алімпійскіх гульнях у Лондане будуць разыграны 302 камплекты медалёў ў 37 дысцыплінах. Найбольшая колькасць медалёў будзе разыграна ў лёгкай атлетыцы — 47 камплектаў і ў плаванні — 34 камплекты.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Фотагалерэя алімпійскага Лондана

Вось так выглядаюць арэны, на якіх будуць праходзіць спаборніцтвы лонданскай Алімпіяды.

Алімпійскі стадыён. Умяшчальнасць — 80.000 чалавек. Тут будуць праходзіць спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, цырымоніі адкрыцця і закрыцця Алімпіяды.

Цэнтр водных відаў спорту. Умяшчальнасць — 17.500 чалавек. Тут пройдуць спаборніцтвы па ныранні, сінхронным плаванні, плаванні, сучасным пяцібор'і.



Баскетбол-арэна. Умяшчальнасць 12.000. Тут пройдуць алімпійскія турніры па баскетболе і гандболе.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл. (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906 nv@promedia.by http://www.nv-online.by

ISSN 2071-9647

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродка масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/ 0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 1.08.2011 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 29480 экз. Заказ №3665.